Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (б) Беларусі.

ГОД ВЫДАЧЫ—XV
№ 22 (3926)
СУБОТА, 24 СТУДЗЕНЯ 1931 г.

Цана нумару 5 кап.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫНКА

Сьцежкай двурушніцтва і здрады

Партыя бальшавікоў перамагла ў настырчніку і прывяла краіну пралетарскай дыктатуры ў пэрыяд разгорнутага будаўніцтва сацыялізму. Гэта стала магчымым таму, што УсеКП(б) ні на крох не адступала ад ленінскай лініі, няўхільна сьледавала наказам Леніна ва ўсёй сваёй дзейнасьці, непрымірыма змагаючыся з усякага роду апартуністамі і згодніками. Пралетарыят пад кіраўніцтвам сваёй партыі ўзяў уладу ў свае рукі толькі таму, што ў змаганьні заўсёды выконваў ленінскія ўмовы, у прыват насьці ўмовы аб заваяваньні на свой бок большасьці працоўнага насельніцтва. Тав. Ленін пакінуў гэтага пісаў:

«Каб заваяваць большасьць насельніцтва на свой бок, пралетарыят павінен, па-першае, скінуць буржуазію і захапіць дзяржаўную ўладу ў свае рукі; ён павінен, па-другое, увесьці савецкую ўладу, разбіўшы дашчэнту стары дзяржаўны апарат, чым ён адразу падрывае панаваньне, аўтарытэт, уплыў буржуазіі і дробна-буржуазных згодникаў у асяродзішчы пралетарскіх працоўных мас. Ён павінен, па-трэцяе, ДАБІЦЬ УПЛЫЎ БУРЖУАЗІІ І ДРОБНА-БУРЖУАЗНЫХ ЗГОДНІКАЎ СЯРОД БОЛЬШАСЬЦІ непралетарскіх працоўных мас РЭВАЛЮЦЫЙНЫМ АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕМ ІХ эканомічных патрэб ЗА КОШТ ЭКСПЛЕАТАТАРАЎ».

Праз ўзброенае паўстаньне, праз жорсткія бае на барыкадах панаваньне буржуазіі было скінута. Пралетарыят узяў уладу ў свае рукі. Стары дзяржаўны апарат дашчэнту разьбіт. Аўтарытэт і ўплыў буржуазных і дробна-буржуазных згодникаў у асяродзішчы непралетарскіх працоўных мас канчаткова падарваны рэвалюцыйнымі мерапрыемствамі бальшавіцкай партыі. Непралетарскія працоўныя масы, у першую чаргу бядняцка-серадняцкая сялянства, пайшлі за пралетарыятам, за бальшавікамі. Кастрычніцкая рэвалюцыя, кіруемая бальшавіцкай партыяй на чале з Леніным, усе раней існаваўшыя буржуазныя, дробна-буржуазныя, нацыяналістычныя і прадажна-згодніцкія палітычныя партыі вымела на сьметнік гісторыі.

Перамога Кастрычніка на Беларусі, якая здабыта пад непасрэдным кіраўніцтвам бальшавіцкай арганізацыі, намесла настолькі зьнішчальны ўдар па буржуазна-нацыяналістычных партыях і групоўках Беларусі, што яны ня толькі страцілі свой і без таго вельмі не вялікі палітычны ўплыў на некаторыя групы сялянства (у рабочых масах яны абсалютна ніякім аўтарытэтам і падтрыманьнем ніколі не карысталіся), але і рассыпаліся арганізацыйна.

Удзельнікі гэтых партый—меншавікі, эсэры, нацыяналісты — апынуліся на тым баку барыкад, вораг і праўдай служылі і служаць класу капіталістаў, памешчыкаў. Адзінкі зьмякілі вехі. Пайшлі за пралетарскую рэвалюцыю. Сярод гэтых адзінак былі і тыя, якія сёньня зьлугоюцца заядлымі нацыянал-дэмакратамі, контр-рэвалюцыянэрамі. Сярод апошніх былі такія зьмяневехаўцы, як Жылуновіч і Ігнатоўскі, якія прышлі і з меншавікіх, і эсэраўскіх бевароўскіх нацыяналістычных партый, як Прышчэпаў, які быў эс-эрам, Баліцкі, былы барацьбітовец, Алесь Адамовіч і іншыя.

Што прымусіла іх зьмяніць вехі, што прымусіла іх пралезьці ў КП(б)Б?

Адказ на гэта пытаньне мы зможам атрымаць толькі тады, калі пільна прасочым той гістарычна вялікі шлях змаганьня КП(б)Б за ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі ў БССР, за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі.

У нацыянальна-культурным будаўніцтве, як і ва ўсёй сваёй рабоце, КП(б)Б пад кіраўніцтвам свайго ЦК няўхільна праводзіла генэральную лінію партыі, усю сваю работу будавала на прынцыпах бальшавізму. І толькі дзякуючы гэтаму КП(б)Б набыла надзвычай гіганцкія посьпехі ў ажыцьцяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі. Усе кіруючыя цэнтральныя і раённыя, а таксама вясковыя ўстановы вядуць сваю работу на беларускай мове. Шырока разьвіваецца беларуская культура і літэратура нацыянальная на форме і сацыялістычная па зьмесьце. Выразным паказальнікам шпаркага разгортваньня будаўніцтва культуры ў БССР зьяўляецца хаця-б той факт, што на сёньняшні дзень мы маем па рэспубліцы 12 вышэйшых навучальных устаноў, шпаркі рост тэхнікумаў, сямігадовых і пачатковых школ. З посьпехам праводзіцца ўсеагульнае абавязковае навучаньне і ліквідацыя нялікменнасьці.

Гэтых посьпехаў КП(б)Б дабіўся ў непрымірымым змаганьні супроць вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму, супроць беларускага контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, і шавінізму розных копераў. Ва ўсім сваім змаганьні і рабоце па ажыцьцяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі КП(б)Б і яе Цэнтральны Камітэт аддавалі надзвычай вялікую ўвагу стварэньню пралетарскіх кадраў з беларускіх рабочых, батракоў і сялянскай беднаты. У выніку правільнага ажыцьцяўленьня нацыянальнай палітыкі КП(б)Б надзвычай шпарка вырасла і зараз у сваім складзе мае блізка капя 40 тысяч членаў і кандата ў партыі. Ня меншых посьпехаў дабіўся КП(б)Б і ў КАРЭНІЗАЦЫІ партыйнага, дзяржаўнага і гаспадарчага апарату, у справе падрыхтоўкі і карэнізацыі кіруючых кадраў у рэспубліцы.

У змаганьні зь гэтыя посьпехі КП(б)Б сустракаўся з радам выпадкаў, калі нацыянал-апартуністы, раней за ўсё тыя элементы, якія прышлі ў КП(б)Б з дробна-буржуазных і нацыянал-згодніцкіх партый, прабавалі этакаваць генэральную лінію партыі, прабавалі працягнуць у КП(б)Б свой буржуазна-нацыяналістычны хлам. Сярод нацыянал-апартуністаў мы ў першую чаргу сустраваліся з такімі фігурамі, як Жылуновіч і Ігнатоўскі.

Жылуновіч, Ігнатоўскі, а разам з імі Прышчэпаў, Баліцкія, Адамовічы, і іншыя элементы гніпога інтэлігенцкага адарванага ад мас буржуазна-нацыяналістычнага руху, пралезшы ў партыю, ня толькі не ўспрынялі ленінскіх прынцыпаў бальшавізму, а, застаючыся вернымі сваім нацыяналістычным поглядам, прабавалі з першых-жа дзён прабываньня ў КП(б)Б пропіпаставіць свае погляды генэральнай лініі партыі.

Жылуновіч, прышоўшы ў КП(б)Б з дробна-буржуазнага беларуска-нацыяналістычнага руху, зараз-жа паказаў свой твар заядлага нацыяналіста. Ён у пэрыяд канструяваньня першага ўраду БССР выступіў з патрабаваньнем захаваць у КП(б)Б самастойную беларускую сэкцыю. Будучы на чале першага ўраду БССР, ён проціпастаўляў свае буржуазна-нацыяналістычныя погляды і імкненьні бальшавіцкаму кіраўніцтву, за што быў адхілен ад работы. Зараз беларускія нацыянал-дэмакраты, дый сам Жылуновіч, прабуюць спэкулявацъ на гэтым факце. Яны заяўляюць: «з гісторыі ніхто ня выкрасьліць таго факту, што Жылуновіч, будучы першым старшынёю ўраду БССР, адыграў пэўную ролю ў стварэньні Савецкай Беларусі». Так, факт застаецца фактам. Жылуновіч пэўную ролю адыграў. Але гэта роля была настолькі чужой бальшавізму, мізэрнай і паганенькай, што ні ў якім разе ня можа прэтэндаваць ні сваім зьместам, ні разьмерамі на тое, каб хоць якое-небудзь месца заняць на старонках гісторыі змаганьня рабочае клясы БССР за ўмацаваньне дыктатуры пралетарыяту.

За пэрыяд свайго прабываньня ў КП(б)Б Жылуновіч займаў рад адказных пастоў (БДВ, Наркамасьветы і інш.). І ўсюды, дзе толькі знаходзіўся на рабоце, ён праводзіў сваю варожую пралетарыяту, нацыянал-дэмакратычную лінію, груба скажаў генэральную лінію партыі, згуртоўваў вакол сябе нацыянал-дэмакратычныя элементы. Аб сыстэме нацыянал-апартуністычных памылак Жылуновіча, аб яго процістаўленьні сваёй буржуазнай, нацыянал-дэмакратычнай лініі генэральнай лініі партыі гаварыць ня трэба. Аб іх наш партыйна-савецкі друк на працягу апошніх год пісаў надзвычай многа. Падкрэсьлім толькі, што Жылуновіч, стаўшы на дэурушніцкі шлях, на шлях ашуканства і здрады партыі, зьяўляючыся рупарам нацыяналістычных ідэй, агентам контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму скарыстоўваў сваё прабываньне ў КП(б)Б для змаганьня супроць бальшэвізму, за капіталістычную рэстаўрацыю ў БССР, за стварэньне буржуазна-кулацкай Беларусі.

Нацыянал-дэмакратычная фігура ІГНАТОЎСКАГА выплыла на арэну палітычнага жыцьця БССР таксама з уклоньня дробна-буржуазных, нацыяналістычна-буржуазных і контр-рэвалюцыйных партый, якія вялі шапёнае змаганьне супроць дыктатуры пралетарыяту. Прышоўшы ў партыю, Ігнатоўскі запэўніваў, што ён ачысьціцца ад нацыяналістычнай, дробна-буржуазнай твані і будзе стаяць на марксыцка-ленінскіх пазыцыях.

Ці зрабіў гэта Ігнатоўскі? Ці зьдзейсьніў ён свае запэўніваньні?

Ніколі і ні ў якай меры. Прабываньне яго ў партыі на працягу дзесятку год, знаходжаньне ў цэнтральных кіруючых органах КП(б)Б даказала гэта з усёй выразнасьцю.

Будучы членам ЦК, Ігнатоўскі ня толькі ня быў на чале змаганьня КП(б)Б з розными ўхіламі, у тым ліку і нацыяналістычнымі, за генэральнай лініі партыі, а наадварот, згуртоўваючы вакол сябе нацыянал - дэмакратычныя элементы, процістаўляў свае буржуазна - нацыяналістычныя погляды ленінскай лініі партыі, падмяняў тэорыю разьвіцьця класавага змаганьня нацыянальнай і г. д. У сваіх навуковых працах ён ідэалізаваў дробна-буржуазныя і нацыяналістычныя партыі і іх ролю ў рэвалюцыйным руху. На практычнай рабоце ў Наркамасьветы і, нарэшце, у БАН ня толькі не правяў сябе, як член партыі, а наадварот, паказаў свой твар, як яўны агент контр-рэвалюцыйнага нацыянал - дэмакратызму ў радах КП(б)Б.

На працягу ўсяго пэрыяду і Жылуновічу і Ігнатоўскаму партыйная арганізацыя паказвала на іх нацыянал-апартуністычныя памылкі. Аднак, ні адзін, ні другі далей фармальнага прызнаньня гэтых памылак не пайшлі. І Ігнатоўскі, і Жылуновіч пасьля сваіх заяў, апублікаваных у друку, а таксама і паданых у партыйныя органы, НЯ СТАЛІ НА ШЛЯХ ВЫПРАЎЛЕНЬНЯ СВАІХ УЛАСНЫХ ПАМЫЛАК, якія, да рэчы, заявамі імі прызнаваліся і асуджаліся. Чаго варты пасьля ўсяго гэтага іх заявы? У гэтых заявах пустая алілюйшчына, улашчэная ўсім апартуністычным элементам. ЯНЫ ПРЫШЛІ Ў КП(б)Б ЗАЯДЛЫМІ НАЦЫЯНАЛІСТАМІ І ТАКІМІ-Ж ЗАСТАЛІСЯ ДА СЁНЕШНЯГА ДНЯ.

Для таго, каб хаваць свой твар двурушніка, Ігнатоўскі пры дапамозе нацыянал - дэмакратаў фальсыфікаваў свае рэвалюцыйныя заслугі, скажаючы гістарычныя факты. У асьвятленьні партызанскага руху на Беларусі ў пэрыяд белапольскай акупацыі Ігнатоўскі прысвоіў заслугі кіраўніцтва гэтым рухам так званай «беларускай камуністычнай арганізацыі» і зусім змазаў тое сапраўднае бальшавіцкае кіраўніцтва КП(б)Б, пры якім адбываўся партызанскі рух рабочых і працоўнага сялянства на Беларусі. Нацыянал-апартуністы ня цураліся нават такіх нізкіх мэтадаў самарэклямы.

Беларускім партызанскім рухам рабочых і бядняцка-серадняцкіх мас сялянства кіравала КП(б)Б, пры яе непасрэдным удзеле адбывалася змаганьне рабочых і працоўнага сялянства за саветы на Беларусі. «Беларускай камуністычнай арганізацыі», як такавой, на было — была нацыянал - дэмакратычная група, якая пасьля вызваленьня Менску ад белапольскай акупацыі імкнулася проціпаставіць сябе камуністычнай партыі Беларусі.

Між іншым, аб гэтым надзвычай добра ведаў і Жылуновіч. Аднак, ён ня толькі на імкнуўся выправіць, як член партыі, агідныя скажэньне гістарычных фактаў, а наадварот, імкнуўся гэта скажэньне пагнябіць.

Гэтых фактаў дзеолі для таго, каб убачыць, што і Жылуновіч, і Ігнатоўскі разам з К°, прышлі ў партыю для таго, каб скарыстаць свае прабываньне ў ёй для змаганьня супроць бальшавізму. І калі іх вылазкі на працягу ўсяго пэрыяду НЭП'у былі толькі спробамі атакаваць лінію партыі, працягнуць у КП(б)Б свой ідэйны нацыяналістычны хлам, то па меры разгортваньня сацыялістычнага наступленьня на ўсім фронце, разгортваньня сацыяльнай калектывізацыі і на яе аснове ліквідацыі кулацтва як класы, гэтым атакі набылі больш частую, рэзкую і больш захаваную форму. Лідэры нацыянал-апартуністычнага ўхілу, перакананыя ў тым, што за сабой ня маюць хоць колькі-небудзь значнай часткі пасьлядоўцаў, стапі на шлях двурушніцкай, эдрэдыцка-падрыўной дзейнасьці. І гэтым шляхам, шляхам двурушніцтва і здрады, вялі змаганьне супроць лініі КП(б)Б і яе Цэнтральнага Камітэту.

Абвастрэньне вялікага змаганьня, труднасьці росту сацыялістычнага будаўніцтва, шапёная падрыхтоўка замежных капіталістаў да інтэрвэнцыі супроць СССР выклікалі ажыўленьне ў контр - рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратычным лягеры. Тая канспірацыя нацыянал - дэмакратычных, контр-рэвалюцыйных сіл, якая адбывалася на працягу ўсяго пэрыяду НЭП'у, перайшла на чарговую ступень. Нацыянал-дэмакратычная беларуская контр-рэвалюцыя — апора польскага фашызму ўнутры БССР —стала на шлях актыўнага змаганьня супроць пралетарскай дыктатуры. Аб гэтым выразна сьведчыць раскрытая контр-рэвалюцыйная нацыянал - дэмакратычная група інтэлігентаў.

Нацыянал - дэмакратычная агентура ўнутры КП(б)Б — нацыянал-апартуністы — перайшлі да абвостранага змаганьня супроць лініі партыі. Нацыянал-апартуністы поруч з нацыянал-дэмакратамі вядуць змаганьне на толькі супроць лініі партыі, але і супроць саветаў. Жылуновіч, Ігнатоўскі і К° прымаюць удзел на палітычных (пад відам сямейных) вечарох беларускіх контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў, перадаюць ім сакрэтныя пастановы і весткі аб партыі, інфармуюць аб рабоце штабу КП(б)Б — Цэнтральнага Камітэту, абмяркоўваюць мэтады змаганьня супроць лініі партыі, супроць пралетарскай дыктатуры. Цяжка ўбачыць розьніцу паміж «камуністамі» Ігнатоўскім, Жылуновічам і контр-рэвалюцыйнымі нацыянал-дэмакратамі Ластоўскім, Лясіка, Некрашэвічам і інш. Розьніца паміж імі заключалася толькі ў тым, што першыя два былі здрадзінкамі партыі, насілі ў кішэні партбілеты ды прабавалі раз гарнуць групавое змаганьне ў КП(б)Б.

Згуртоўваючы вакол сябе найбольш хісткіх членаў партыі — выхадцаў з нацыяналістычна-буржуазных, меншавіцкіх і эсэраўскіх партый, апіраючыся на нацыяналістычна настроеныя элементы ў КП(б)Б, Ігнатоўскі і Жылуновіч імкнуліся процістаўляць нацыянал - апартуністаў проціпаставіць кіраўніцтву КП(б)Б, разарнуць групавое змаганьне.

Зусім ясна і бязумоўна тое, ШТО І ЖЫЛУНОВІЧ, І ІГНАТОЎСКІ, І УСЯ НАЦ. - АПАРТУНІСТЫЧНАЯ ГРУПА, УЗЯТАЯ ЦАЛКАМ, НЯ МЕЛІ АБСАЛЮТ НА НІЯКАГА УПЛЫВУ НА МАСЫ, НЯ МЕЛІ СЯРОД ІХ АБСАЛЮТНА НІЯКАГА ПАДТРЫМАНЬНЯ. Аднак, было-б вялікай палітычнай памылкай ад маўляць той факт, што нацыянал-апартуністы сваёй падрыўной двурушніцкай і здрадніцкай дзейнасьцю тармазілі ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі як па нацыянальна - культурным будаўніцтве, так і ва ўсёй іншай рабоце КП(б)Б. Мінулыя глыбокія прарывы, грубыя скажэньні партыйнай лініі ў рабоце Наркамзему, Наркамасьветы, БДВ і нядаўна выкрытыя прарывы ў рабоце БАН, — усё гэта зьвонкі адкага панцуга — змаганьня агентуры контр-рэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму супроць лініі КП(б)Б і яе бальшавіцкага ЦК.

КП(б)Б на працягу ўсяго пэрыяду сваёй дзейнасьці пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэту вяла бязьлітаснае змаганьне за генэральную лінію партыі, супроць правых апартуністаў, галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць «левых» апартуністаў, якія граюць на руку і ўступаюць у бяспрынцыпны блёк з яўна правымі, КП(б)Б заўсёды трымала высока сьцяг бальшавіцкага непрымірымага змаганьня супроць ухілаў і ў нацыянальным пытаньні. КП(б)Б бязьлітасна біла па праявах вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму, як галоўнай небясьпецы ва ўмовах існаваньня рэштак культурнай і эканамічнай нярэўнасьці нацыянальнасьцяй, як спадчыны царызму, па беларускім контр - рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызьме і шавінізмах усіх копераў.

Кастрычніцкі пленум ЦК КП(б)Б, які адбыўся ў мінулым годзе, гэта змаганьне паставіў на яшчэ больш прынцыповую палітычную вышыню, прызнаўшы маўляўсаць нацыянал - апартуністычных поглядаў несумяшчальнай з прыналежнасьцю да КП(б)Б. Адначасова пленум вывеў са складу ЦК і бюро ЦК нацыянал-апартуніста Ігнатоўскага і накіраваў пад загад ЦК УсеКП(б) былога сакратара ЦК КП(б)Б Васілевіча. Гэтым самым Цэнтральны Камітэт КП(б)Б паклаў пачатак бязьлітаснаму ачышчэньню радоў КП(б)Б ад нацыянал-апартуністычных элементаў —агэнтуры беларускага контр - рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму.

Нашы далейшыя задачы —неаслабна працягваць гэту работу і няўхільна мабілізаваць масы на змаганьне супроць нацыянал-апартуністаў, контр-рэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму і шавінізмаў іншых копераў, ставячы ў цэнтр увагі змаганьне супроць галоўнай небясьпекі на даным этапе — вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму. Задача партыйных арганізацый заключаецца ў тым, каб з яшчэ большай настойлівасьцю ажыцьцяўляць ленінскую нацыянальную палітыку і яе сустаўную частку — беларусізацыю, яшчэ больш узмацніць сваё кіраўніцтва разьвіцьцём беларускай літаратуры і культуры нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесьце. Задача партыйных арганізацый і кожнай ячэйкі КП(б)Б заключаецца ў тым, каб яшчэ больш шырока разгарнуць палітычна-масавую работу сярод інтэлігенцыі, сярод вучнёўскай моладзі. І, нарэшце, партыйныя арганізацыі павінны рашучым парадкам узмацніць сваё змаганьне за падрыхтоўку кіруючых і навуковых кадраў з карэнных беларускіх рабочых, батракоў, калгасьнікаў і беднаты.

Зразумела, што справа ня вычэрпваецца пастановамі ЦКК КП(б)Б па справе Ігнатоўскага і Жылуновіча. ЦКК працягвае барацьбу супроць элемэнтаў нацыянал-апартуністычнай групоўшчыны. Самачыстка радоў арганізацыі, якая праходзіць пры актыўнейшым удзеле найшырэйшых партыйных мас, узмоцніць яе бязадпольнасьць у барацьбе за генэральную лінію партыі.

Уся гэта работа павінна адбывацца на фоне бязьлітаснага змаганьня за выразнае правядзеньне генэральнай лініі партыі. Задачы трэцяга рашаючага году пяцігодкі патрабуюць няўхільнага ўзьняцьця яшчэ на большую вышыню палітычнай актыўнасьці шырокіх мас рабочых, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў — адназасобнікаў. Толькі змаганьнем за бальшавіцкія ленінскія прынцыпы ва ўсёй рабоце, сыстэматычна ачышчаючы свае рады ад правых і «левых»-апартуністычнага і нацыянал-апартуністычнага шляху, партыйныя арганізацыі соравацца з тымі задачамі, якія перад імі паставіў XVI зьезд.

Аб кантрактацыі яравых пасеваў 1931 г.

Да ўсіх партыйных, савецка-гаспадарчых, каапэрацыйна-калгасных і камсамольскіх арганізацый

Перавыкананьне за мінулыя два гады заданьняў пяцігадовага пляну, у асаблівасьці па галінах цяжкой індустрыі і вытворчасьці сельска-гаспэдарчага машынабудаўніцтва, дае магчымасьць савецкай уладзе ў трэцім годзе пяцігодкі яшчэ больш павялічыць супроць папярэдніх гадоў укладаньні ў сельскую гаспадарку і ўзмацніць, такім чынам, дапамогу з боку дзяржавы вёсцы на справу капектывізацыі бядняцка - серадняцкіх гаспадарак і ажыцьцяўленьня заданьня ліквідацыі кулацтва, як класы.

У адпаведнасьці з гэтым і ў сувязі з надыходзячай кампаніяй па кантрактацыі яравых пасеваў Савет Народных Камісараў СССР і Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) лічаць неабходным правядзеньне наступных асноўных мерапрыемстваў:

I. МЕРЫ ДАПАМОГІ ДЗЯРЖАВЫ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ

1. Накіраваць для сельскай гаспадаркі на працягу 1931 году 120 тысяч ТРАКТАРАЎ (у пераводзе на 10 сілавых трактар) агульным коштам у 200 мільёнаў руб.

2. Збыш існуючых 360 машына-трактарных станцый арганізаваць на працягу 1931 году 1.040 НОВЫХ МАШЫНА-ТРАКТАРНЫХ СТАНЦЫЙ з агульным трактарным паркам у 980 тысяч цягавых сіл з тым, каб вясной 1931 г. працавала 1.105 машына-трактарных станцый з трактарным паркам у 992 тысячы сіл, забясьпечваючых пасеў машына-трактарнымі станцыямі вясной 1931 году 18 мільёнаў гэктараў замест 4 мільёнаў гэктараў у мінулым годзе. Накіраваць на капітальнае будаўніцтва машына-трактарных станцый у 1931 годзе 540 мільёнаў руб.

3. Падвоіць у 1931 годзе забясьпячэньне сельскай гаспадаркі СЕЛЬСКА - ГАСПАДАРЧЫМІ МАШЫНАМІ супроць 1930 году (768 мільёнаў руб. замест 400 мільёнаў руб., у тым ліку на 157 мільёнаў руб. уборачных машын). Накіраваць асноўную частку гэтых машын у калгасы і машына-трактарныя станцыі па ўстаноўленых танных цэнах. Забясьпечыць сельскую гаспадарку 7 ТЫСЯЧ грузавых і легкавых АУТАМАБІЛЯЎ, у тым ліку ня менш 2.000 машына-трактарным станцыям.

5. Забясьпечыць сельскую гаспадарку ў 1931 годзе МІНЭРАЛЬНЫМІ УГНАЕНЬНЯМІ ў колькасьці 24 мільёнаў цэнтнэраў (145 мільёнаў пуд.) на суму ў 105 мільёнаў руб., у тым ліку да вясны — 13 мільёнаў цэнтнэраў (78 мільёнаў пудоў).

6. Забясьпечыць сельскую гаспадарку сродкамі БАРАЦЬБЫ СА ШКОДНІКАМІ да сэзону на суму 40 мільёнаў руб. замест 19 мільёнаў руб. у мінулым годзе.

7. Для забясьпячэньня росту ўраджаю ў калгасах адпусьціць 21 МІЛЬЁН ЦЭНТНЭРАЎ (126 мільён. пуд.) гатуновага і ПАЛЕПШАНАГА НАСЕНЬНЯ, у тым ліку:

збожжавых — 11.500 тыс. цэнтн.
кукурузы — 600 тыс. цэнтн.
спанэчніку — 500 тыс. цэнтн.
бабовых — 1.100 тыс. цэнтн.
соі — 250 тыс. цэнтн.
цукровых буракоў — 430 тыс. цэнтн.
ільну-даўгунцу — 760 тыс. цэнтн.
ільну-кудрашу — 120 тыс. цэнтн.
канапель — 310 тыс. цэнтн.
насеннае бульбы — 2.500 тыс. цэнтн.
бавоўны — 1.600 тыс. цэнтн.
іншых — 1.330 тыс. цэнтн.

Фонд гатуновых збожжавых стварыць з дзяржгатоўнду ў разьмеры 4,1 міл. цэнтн. і таварна-гатуновых з цэнтралізаваных загатовак у разьмеры 7,4 міл. цэнтн.

З агульнай сумы збожжавага гатуновага насеньня (11.500 тыс. цэнтн.) адпусьціць у парадку абмену на звычайнае збожжа 10.900 тыс. цэнтн. і без абмену 600 тыс. цэнтн. насеньня Дзяржгатфонду ў парадку кантрактацыі са зваротам увосень. Пры выдачы пасеўшчыкам насеньня надбаўка на загатоўчыя цэны гатуновага і палепшанага насеньня не павінна перавышаць 15 процантаў.

8. САЎГАСАМ «Зернотреста» аказаць ДАПАМОГУ КАЛГАСАМ шляхам веснавога ворыва ў калгасах ня менш 500.000 гэктараў і пасеву ня менш 500.000 гэктараў. Узмацніць усе іншыя віды дапамогі саўгасаў калгасам (агрэгаламэта, выкарыстаньне сельска-гаспадарчых машын, рамонт, падрыхтоўка вадраў і інш.).

9. Адпусьціць для калгасаў і машына-трактарных станцый МІЛЬЯРД ПЯЦЬДЗЕСЯТ МІЛЬЁНАЎ РУБЛЁЎ на дзярж бюджэце і доўгатэрміновым крэдыце.

10. Апрача ўсіх вышэй паказаных мерапрыемстваў, абавязаць Дзяржаўны банк адпусьціць для грашовага АВАНСАВАНЬНЯ пасеўшчыкаў, якія кантрактуюць прадукцыю свайго палаводзтва, 355 МІЛЬЁНАЎ рублёў на ўсе культуры (як таварныя, так і насенныя), асноўная частка якіх павінна быць адпушчана ў пэрыяд апрацоўкі і перад уборкай.

Усе гэтыя ўкладаньні павінны забясьпечыць вялізарны рост тэхнічнага ўзбраеньня і матар'яльнай базы калгаснага руху, які разгортваецца, і павялічыць тым самым сырцовыя і харчовыя рэсурсы краіны.

Ставячы задачай карэнным чынам папоўніць на гэтай аснове забясьпячэньне прамысловасьці сырцом і працоўных харчаваньнем, абавязаць Наркамснаб і НКЗем СССР правесьці праз сельска-гаспадарчую каапэрацыю, Калгасцэнтр, Трактарацэнтр і Насеннаводнапгасцэнтр кантрактацыю яравых пасеваў 1931 году на наступных асновах:

II. ПА ЗБОЖЖАВЫХ І АЛЕЙНЫХ КУЛЬТУРАХ

1. У станавіць плян кантрактацыі збожжавых і алейных культур па калгасах і бядняцка-серадняцкіх аднаасобных гаспадарках у разьмеры 58 МІЛЬЁНАЎ ГЭКТАРАЎ, у тым ліку:

праз Хлебацэнтр — 39.500 тыс. гэктар.
праз Трактарацэнтр — 15.500 тыс. гэктар.
праз Насеннаводнапгасцэнтр — 3.000 тыс. гэктар.
(гатуновых пасеваў для гатунковай рэпродукцыі)

Па культурах кантрактацыю правесьці:

збожжавых — 51.000 тыс. гэктар.
спанэчніку — 4.430 тыс. гэктар.
соі — 400 тыс. гэктар.
бабовых — 2.000 тыс. гэктар.
рысу — 170 тыс. гэктар.

2. Апрача адпускаемых машын і вытворчых крэдытаў, адпусьціць для грашовага авансаваньня ПРАПАШНЫХ КУЛЬТУР 40 мільёнаў руб., у тым ліку:

для спанэчніку — 9 мільёнаў руб.
для кукурузы — 10 мільёнаў руб.
для соі — 6 мільёнаў руб.
для іншых бабовых — 9 мільёнаў р.
для рысу — 6 мільёнаў руб.

Выдаваць аванс перад акучваньнем і абворваньнем.

Пры выдачы СПАНЭЧНІКУ і СОІ забясьпечыць выдачу за наяўны разрахунак калгасам для іх членаў па 4 клгр. алею і па 8 клгр. жмыхі за кожны цэнтнэр; аднаасобным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам — па 3 клгр. алею і па 6 клгр. жмыхі за кожны зданы цэнтнэр спанэчніку і соі.

III. ПА БАВОЎНЕ

Закантрактаваць увесь чаканы ўраджай бавоўны-сырцу ў калгасах і бядняцка-серадняцкіх гаспадарках на 1931 год у колькасьці 19 МІЛЬЁНАЎ ЦЭНТНЭРАЎ.

2. Дадаткова да існуючых у бавоўняных раёнах 19 машына-трактарных станцый арганізаваць у 1931 годзе 130 МАШЫНА-ТРАКТАРНЫХ СТАНЦЫЙ з трактарным паркам у 125 тыс. конскіх сіл, у тым ліку да вясны — 118 машына-трактарных станцый з вхопам імі 1.200 тыс. гэктараў бавоўняных пасеваў.

3. Завезьці ў бавоўняныя раёны і сэзону палявых работ 48 тыс. бавоўняных сявалак, у тым ліку 11.000 — чатырох і двухрадковых; 55.000 КУЛЬТЫВАТАРАЎ, у тым ліку 2.000 трактарных; 23.000 акучнікаў і 1.000 бавоўняна-ўборачных машын.

4. Адпусьціць у 1931 годзе бавоўняным калгасам па дзяржаўных танных цэнах 8.200 тыс. цэнтн. (50.000.000 пудоў) збожжа і 1.640 тыс. цэнтн. (10 мільёнаў пудоў) збожжафуражку, пастаўляўшы норму выдачы збожжа на гаспадарку ў строгую залежнасьць ад старанасьці апрацоўкі бавоўняных палёў і колькасьці здаванай дзяржаве бавоўны.

5. Завезьці ў бавоўняныя раёны для продажу бавоўнаводчым гаспадаркам у 1931 годзе ПРАМЫСЛОВЫХ ТАВАРАЎ на суму ня менш 250 МІЛЬЁНАЎ РУБЛЁЎ з тым, каб яны былі праданы бавоўнаводчым гаспадаркам у парадку нэрмальнага таваразвароту па ўстаноўленых дзяржаўных танных цэнах.

6. Адпусьціць для авансаваньня пасеўшчыкаў бавоўны 100 МІЛЬЁНАЎ РУБЛЁЎ з выдачай 20 проц. ад гэтай сумы перад пасевам, 30 проц. — перад першым акучваньнем і 50 проц. — перад трэцім акучваньнем, прычым выдача перад трэцім акучваньнем робіцца толькі ў тым выпадку, калі выканаць першыя два акучваньні.

7. Выдаць пасеўшчыкам бавоўны ў бяспроцантны крэдыт 1.800 ТЫСЯЧ ЦЭНТНЭРАЎ МІНЭРАЛЬНЫХ УГНАЕНЬНЯЎ са зваротам кошту ўгнаеньняў во ўстаноўленыя тэрміны.

8. Выдаць пасеўшчыкам НАСЕНЬНЕ ў колькасьці, якая поўнасьцю пакрывае ўсю патрэбнасьць (1.600 тыс. цэнтн.) у парадку кантрактацыі.

IV. ПА БУРАКОЎ

1. Закантрактаваць усю плошчу пасеваў цукровых буракоў у калгасах і бядняцка-серадняцкіх аднаасобных гаспадарках у колькасьці 1.210 ТЫС. ГЭКТАРАЎ.

2. Арганізаваць у бурачных раёнах 150 машына-трактарных станцый, у тым ліку да вясны 120 машына-трактарных станцый з ахопам 375 тыс. гэктараў буракоў.

3. Завезьці ў бурачныя раёны для продажу пасеўшчынам цукровых буракоў ПРАМЫСЛОВЫХ ТАВАРАЎ НА СУМУ 60 МІЛЬЁНАЎ РУБЛЁЎ з тым, каб яны былі праданы гаспадаркам, якія разводзяць буракі, у парадку нармальнага таваразвароту па ўстаноўленых танных дзяржаўных цэнах.

4. Захаваць у 1931 годзе ўстаноўленую для мінулага году выдачу за кожны здаваны цэнтнэр буракоў дармова 58 клгр. жому і 1,05 клгр. патакі і ў лік платы за буракі 60 грам цукру.

5. Адпусьціць для авансаваньня пасеўшчыкаў буракоў 41 МІЛЬЁН РУБ. з тым, каб у дапаўненьне да ўжо выдаваемых 25 проц. гэтай сумы 50 проц. яе было выдана ў часе прапоўваньня і 25 проц. — у часе ўборкі.

6. Выдаць калгасам і бядняцка-серадняцкім аднаасобным гаспадаркам, якія засяваюць буракі, МІНЭРАЛЬНЫХ УГНАЕНЬНЯЎ (супэрфасфату) у бяспроцантны крэдыт па 2 цэнтн. на кожны гэктар са зваротам кошту ўгнаеньня ва ўстаноўленыя тэрміны і бясплатна бурачнага насеньня па 32 клгр. на кожны гэктар.

V. ПА ІЛЬНЕ І КАНОПЛЯХ

1. Закантрактаваць пасевы ільну і канапель у калгасах і бядняцка-серадняцкіх аднаасобных гаспадарках у наступным разьмеры:

па ільно-даўгунцы на валакно і семя — 1.950 ТЫСЯЧ ГЭКТАРАЎ, па ільно-кудрашы на семя — 400 тысяч гэктараў, па каноплях на валакно і семя — 700 тыс. гэктараў.

2. Арганізаваць у ільнаводчых раёнах на працягу 1931 г. 150 машына-трактарных станцый з трактарным паркам у 75 тыс. сіл з тым, каб да вясны было арганізавана 77 машына-трактарных станцый з трактарным паркам у 38.500 сіл з ахопам 280 тыс. гэкт. пасеву ільну.

3. У дадатак да існуючых ільняных і пяньковых заводаў па першапачатковай апрацоўцы пабудаваць у 1931 годзе 489 НОВЫХ ЗАВОДАЎ, ахапіўшы імі ўсе ільна-канаплявочыя саўгасы, машына-трактарныя станцыі і пункты, у якіх намячаецца пабудова машына-трактарных станцый у 1932 годзе.

Абавязаць ВСНГ СССР выпусьціць у

Міжнароднае і ўнутраное становішча і задачы камсамолу

Даклад т. Л. М. Кагановіча на IX Усесаюзным зьезьдзе камсамолу

Таварышы, 2½ гады, што прайшлі з моманту VIII зьезду камсамолу, былі рашаючымі гадамі для посьпеху справы Кастрычніцкай рэвалюцыі, справы, за якую змагаліся і гінулі на працягу дзесяцігодзьдзяў сотні тысяч людзей, лепшых людзей рабочай клясы.

Ленін ня раз падкрэсьліваў, што мала пранаведаць і весьці клясавае змаганьне,—трэба давесьці справу клясавага змаганьня да канца, г. зн. да перамогі дыктатуры пралетарыяту. Мала заваяваць дыктатуру пралетарыяту, мала ліквідаваць клясу памешчыкаў і буйных капіталістаў,—трэба здолець выкарчаваць карэньні капіталізму, перабудаваць мільёны дробных і драбнейшых селянскіх гаспадарак на сацыялістычны лад.

І гэта адзначальная асаблівасьць апошніх двух год якраз і зьяўляецца тое, што мы разгарнулі наступленьне па ўсім фронце і вырашаем важнейшую і цэнтральную задачу—задачу перабудовы мільёнаў дробных і драбнейшых селянскіх гаспадарак. І на гэтай аснове, на аснове суцэльнай калектывізацыі мы разгарнулі нячуваную ў сусьветнай гісторыі барацьбу за ліквідацыю апошняй сур'ёзнай капіталістычнай клясы, клясы кулакоў, міраедаў.

Партыя і пралетарыят атрымалі вялізарнейшыя перамогі на гэтым фронце толькі таму, што мы змаглі, наперакор поглядам, наперакор імкненьням правых ухілістаў разгарнуць быстрым тэмпам індустрыялізацыю краіны, і, выкарчоўваючы карэньні капіталізму ў краіне, мы выкарчавалі перш за ўсё ідэалёгічныя карэньні буржуазіі з радоў нашай бальшавіцкай пралетарскай партыі (аплёдысмэнты).

Пад якім-бы сьцягам не прабавала прыкрыць свае погляды агентура буржуазнай ідэалёгіі ўнутры нашай партыі—ці пад сьцягам контр-рэвалюцыйнага троцкізму, ці пад сьцягам правага ўхілу, ці пад сьцягам новай розненасьці ў выглядзе права-«левага» блёку,—партыя на-ленінску, па-марксыцку ўмела выкрываць крок за крокам гэта маскаваньне, партыя з посьпехам змагалася з ім і разьбіла яго дашчэнту (аплёдысмэнты).

У гэтым змаганьні камсамол на чале са сваім ЦК займаў баявую пазыцыю і даказаў, што ён умее змагацца за лінію партыі, за яе ленінскі ЦК (аплёдысмэнты).

Дазвольце, таварышы, перадаць вам ад імя Цэнтральнага Камітэту партыі гарачае бальшавіцкае прывітаньне (аплёдысмэнты, крыкі «ура»).

I. Аб сучасным этапе будаўніцтва сацыялізму ў сьвятле гістарычных этапаў рэвалюцыі

Каб ясна ўявіць сабе сутнасьць сучаснага першага будаўніцтва сацыялізму, г. з. т. Сталін па аснове марксыцка-ленінскага аналізу нашай рэчаіснасьці на XVI зьезьдзе партыі агаласіў, што мы ўступілі ў перыяд сацыялізму,—мы пачынаем «сьпяшаць на гэты перыяд у сьвятло гістарычных этапаў нашай рэвалюцыі.

У заключнай прамове на Усерасійскай партыйнай канфэрэнцыі ў 1921 г. Ленін даў наступную характарыстыку перажыванага намі тады перыяду. Ён параўнаў работу камуністычнай партыі з 4-гадовымі курсамі вышэйшых навук.

«Калі параўнаць усю работу камуністычнай партыі з 4-гадовымі курсамі вышэйшых навук, дык наша станоўішча можна акрэсьліць так: мы трымаем пераходны экзамэн з 3-га на 4-ы курс, яшчэ ня вытрымалі яго, але на ўсіх адзнаках вытрымаем. Калі лічыць на курсах, дык першы курс быў з 70-х гадоў мінулага стагодзьдзя да 1903 г., першапачатковы ўступны перыяд ад народніцтва, «рацыяналізму» і ІІ Інтэрнацыяналу да бальшавізму». Гэта—першы курс.

Другі курс—з 1903 г. па 1917 г.,—тут сур'ёзная падрыхтоўка да рэвалюцыі і першы вопыт рэвалюцыі—1905 гады. Трэці курс—з 1917 г. па 1921 г.—тут 4 гады, якія на сваім зьместве больш, чым першыя 40 год. Гэта было выпрабаваньне вельмі дзелавое, калі пралетарыят стаў на чале ўлады, але гэта яшчэ ня было рашучае выпрабаваньне. Калі ў нашай песьні пяецца «гэта ёсьць наш апошні і рашучы бой», дык я павінен сказаць, што, на жаль, гэта ня ёсьць апошні, а адзін з бліжэйшых да апошняга рашучага бою, калі ўжо быць вусім дакладным. А зараз мы трымаем пераходны экзамэн з 3-га на 4-ы курс, а потым нам трэба будзе прайсьці ўвесь 4-ты курс, тады мы будзем сапраўды непераможнымі» (Ленін, выданьне 2, т. XXVI, стар. 409).

Вось перыядызацыя рэвалюцыйнага развіцьця, якая дана Леніным.

У сьвятле гэтай перыядызацыі нас цікавіць канкрэтнае пытаньне—як мы з вамі пасьля 1921 году вытрымалі пераходны экзамэн з трэцяга на чацьверты курс, як мы праходзім 4-ы курс, каб жыць на думцы Леніна, сапраўды непераможнымі.

Перш за ўсё, мы павінны спыніцца на стратэгіі і тактыцы партыі, на аналізе тых шляхоў, якімі ішоў Цэнтральны Камітэт і якімі Цэнтральны Камітэт вёў партыю для вырашэньня гэтай асноўнай задачы. Відома, што меншавікі, змагаючыся з бальшавікамі, гаварылі рабочым: «Мы за сацыялізм, але з іншымі ідзем рознымі шляхамі». І вось на працягу 9 год, прайшоўшых з часу прамовы Леніна, мы стыкнуліся з паўтараньнем унутры нашай партыі гэтага старога меншавіцкага маневру.

«Мы пагодзім не парочым супроць сацыялізму, але мы супроць тэорыі пабудовы сацыялізму ў адной краіне»,—гаварылі зіноўеўцы і троцкісты.

«Мы за індустрыялізацыю мы за пабудову сацыялізму ў адной краіне, але мы разыходзімся ў шляхох»,—гаварылі правыя апартуністы.

Зараз, у 1931 годзе мы можам сказаць, што жыцьцё адкінула шляхі, па якіх нам прапанавалі ісьці троцкісцкая і правая апазыцыі; жыцьцё паказала, што шляхі, якімі вёў партыю наш Цэнтральны Камітэт ад перамогі да перамогі,—адзіна правільныя.

Вы памятаеце, што разгалоссі пачаліся пасьля сьмерці т. Леніна з тлумачэньня яб НЭПе. Спачатку зіноўеўская апазыцыя, а потым троцкісцкі блёк, тлумачылі НЭП, як адступленьне, а ня як базу, а ня як шлях для новага наступленьня сацыялістычных элемэнтаў на капіталістычныя для атрыманьня новых перамог. Адсюль вынікала і паліка, нібе'р'е у сацыялізм, адсюль адрадженьне меншавіцкай тэорыі аб немагчымасьці пабудовы сацыялізму ў адной краіне і прыкрыцьцё гэтай пазіцыі «левымі» фразамі. Цэнтральны Камітэт партыі на-ленінску разглядаў НЭП як глыбокі абыходны рух наперад. ЦК разглядаў НЭП, як абыходны шлях для больш працяжнай, больш упартай, больш настойлівай барацьбы з капіталістычнымі элемэнтамі, які павінен прывесьці да перамогі сацыялізму. Адпаўленьне народнае гаспадаркі і падрыхтоўка ўмоў для новага наступленьня, для новай лабавой атакі ажыўляюцца рэзультатамі посьпехаў гэтага глыбокага абыходнага руху.

Троцкісцкія элемэнты сеялі нибе'р'е ў сілы пралетарыяту, а сілы гэтага абыходнага руху, сеялі нибе'р'е ў тое, што мы зможам канцэнтраваць нашы сілы і ў час ударыць. Правыя-ж хацелі паказаць справу так, што абыходны рух мы павінны весьці бязупынна, што абыходны рух ня ёсьць рух для падрыхтоўкі новае атакі на капіталістычныя элемэнты, а што мы гэты рух будзем весьці доўгі перыяд, пакуль ня прыдзе, нарэшце, на думцы Бухарына—ідэолёга правага апартунізму—мірнае ўрастаньне, калі кулак мірна ўрасьце ў сацыялізм. Гэта быў шлях рэфармізму, шлях лібералізму. Іх манэўры зводзіліся да адступленьня перад націскам кулака і нагоду ў іх складалася тэорыя: «Дзеля чаго весьці наступленьне? Без наступленьня спакайней». Яны не разумелі таго, што вораг манэўрус, вораг можа, ня толькі з посьпехам выгрымалі пераходны экзамэн з 3-га на 4-ы курс, але мы ўжо набліжаемся да завяршэньня 4-га курсу, мы набліжаемся да скапчэньня фундаманту сацыялістычнай эканомікі, г. зн. набліжаемся да таго моманту, калі мы будзем непераможнымі. Гэта акрэсьлівае ўсё выкананьне задачы, пастаўленай Леніным—задачы дагнаць і перагнаць капіталістычныя краіны. Мы разгарнулі нячуваную барацьбу за тэмпы. Камсамол быў не апошнім у гэтай барацьбе за тэмпы. Барацьба за тэмпы азначала ня толькі барацьбу з тымі, хто тармазіў гэтым тэмпы, ня толькі барацьбу з правымі ўхілістамі і з троцкісцкімі элемэнтамі, якія ў сваіх поглядах на тэмпы індустрыялізацыі краіны вышліся. Барацьба за тэмпы азначала, што мы яе вялі ў нашым штодзённым жыцьці, у практыцы. Барацьба за тэмпы прасякнула ў глыбіню, у тушчы мас, на кожны завод, у кожны трэст, у кожнае гаспадарчае аб'яднаньне, у кожнае сяло.

Цэнтральны Камітэт партыі ў сваёй барацьбе за тэмпы не абмяжоўваўся агульнымі дырэктывамі, агульнымі ўказаньнямі. Адзначальнай асаблівасьцю работы Цэнтральнага Камітэту зьяўляецца тое, што мы прасякнулі ў глыбіню, у капкрэтныя пытаньні кожнага гаспадарчага аб'яднаньня, кожнага трэсту. Для нас лічбы пяцігодкі, устаноўленыя спачатку, ня былі фэтышам. Гэтыя лічбы зьмяняліся па-ходу па ўсіх галінах прамысловасьці—і па нафце, і па вугалі, і па металю і г. д.

Рабочыя масы зьнізу адгукнуліся на гэта ідэяй сустрэчнага прамфінпляну, якая зьяўляецца ідэяй барацьбы за тэмпы, барацьбы з тымі, хто прабуе спасыланьнямі на труднасьці тармазіць разьвіцьцё прадпрыемстваў, бо мы павінны ведаць, што справа ня толькі ў тым, каб пабудаваць новы завод, а справа ў тым, каб умець рацыянальна выкарыстаць тыя заводы, якія існуюць, рацыянальна выкарыстаць абсталяваньне, рацыянальна выкарыстаць нашы магчымасьці па павялічэньні колькасьці сырцу, па павялічэньні колькасьці металю, вугалю і г. д. Лёзунг, які быў выкінут масамі, лёзунг «Пяцігодка—за чатыры гады»—не фантазія, а рэзультат вопыту мас, рэзультат вопыту нашай партыі, рэзультат вопыту пралетарыяту і селянства. І мы можам сказаць, што гэты лёзунг мы ажыцьцёвім: мы выканаем пяцігодку за чатыры гады (бурныя аплёдысмэнты).

На XVI зьезьдзе партыі т. Сталін указаў, што ні адна краіна ў сьвеце ня ведае такіх шалёных тэмпаў разьвіцьця і росту, як наша краіна, бо наша краіна ўладае тымі ўдзьвісьцісьцямі і пераватамі, якімі ня можа ўладаць капіталістычная краіна. Гэта паказвае той факт, што, ня гледзячы на сыстэматычнае шкодніцтва клясавых ворагаў, ім не ўдалося затармазіць бурны рост сацыялістычнай гаспадаркі, бо ў руках пралетарскай дзяржавы сканцэнтраваны ўсе рэсурсы краіны; мы рэгулюем і плянуем усе галіны народнай гаспадаркі. Калі, напрыклад, да апошняга году мы для сельскай гаспадаркі акрэсьлівалі больш ці менш прыблізныя плыны, калі мы яшчэ не маглі называць поўнасьцю нашы кантрольныя лічбы народна - гаспадарчым плянам, дык апошні пленум Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б), разгледзеўшы кантрольныя лічбы па сутнасьці, ужо назваў гэта народна-гаспадарчым плянам, які акрэсьлівае ход разьвіцьця для ўсіх галін народнай гаспадаркі, у тым ліку і для сельскай гаспадаркі.

Значэньне нашага росту добра разумеюць нашы ворагі. Нашы ворагі разумеюць, што азначаюць рост і разьвіцьцё народнай гаспадаркі ва ўмовах Савецкага Саюзу. Яны ўжо не сьмяюцца з пяцігодкі, як сьмяяліся раней, а яны ўжо, хутчэй, плачуць ад гэтай пяцігодкі, бо яны бачаць, што побач з нашым ростам у іх заняпад.

Значэньне нашага росту

Наша пераможнае наступленьне і папярэдзіла адказ на пытаньне, якое Ленін паставіў: «хто каго»—ці кулак нас возьме за горла, ці кулак нас прымусіць пайсьці да яго, спачатку па дробныя ўступкі, а потым і па большыя, ці мы яму нанясем удар на зборжавым фронце, каб потым разгарнуць барацьбу за канчатковую ліквідацыю яго, як клясы.

Сёньня мы можам сказаць, што на аснове дасягненьняў у галіне калгаснага будаўніцтва, на аснове суцэльнай калектывізацыі мы з посьпехам вядзем барацьбу за ліквідацыю кулацтва, як клясы.

Мы маем буйнейшыя зьмены, перш за ўсё, у сельскай гаспадарцы. Я ня буду тут прыводзіць вялікай колькасьці лічбаў, бо лічбы прыведзены ў выстарчальнай колькасьці ў нашым друку, асноўныя лічбы ў гэтай галіне прыводзіў т. Сталін на XVI партзьезьдзе, а навейшыя даныя ў адносінах падышоўшага трэцяга году пяцігодкі і вынікаў апошніх першых двух год пяцігодкі прыведзены ў пастановах сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК і ў дакладзе т. Молатава на сэсіі ЦВК.

Я хачу толькі падкрэсьліць, што ў выніку зьмен у эканоміцы нашай сельскай гаспадаркі, зьмен у сацыяльнай структуры сельскай гаспадаркі мы будзем мець да канца 1931 году больш паловы калектывізаваных селянскіх гаспадарак. Мы будзем мець 4 асноўныя збожжавыя вобласьці, амаль цалкам калектывізаваныя. Рост калектывізацыі прыводзіць ня толькі да зьмены сацыяльнай структуры нашай сельскай гаспадаркі, але і да росту эканамічнага добрабыту вёскі, росту эканамічнага добрабыту савецкай рэспублікі, росту колькасьці прадуктаў у нашай краіне, росту колькасьці збожжа, тэхнічных культур. Зараз мы ставім перад сабой цэнтральнай задачай у галіне сельскай гаспадаркі вырашэньне жывёлагадоўчай праблемы на базе саўгасаў і калгасаў, так, як мы вырашылі збожжавую праблему. Мы ўжо зараз пакрылі з лішкам тую ўдзельную вагу ў збожжавай гаспадарцы, якую займаў кулак, і разьбілі разьлікі правых, для іх шалохалі, што калі мы павядзем наступленьне на кулака, дык у нас ня будзе збожжа, у нас ня будзе прадуктаў.

Па валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі доля агрэгаванага сэктару прадугледжвалася ў пяцігодцы для 1932-33 г. у разьмеры 14,7 проц; фактычна-ж яна склала ў 1930 г. 24 проц., а ў 1931 г. будзе складаць 42 проц. Таварная-ж прадукцыя агрэгаванага сэктару ў 1931 г. будзе складаць больш 50 проц. усёй таварнай прадукцыі.

Мы, такім чынам, а посьпехам вырашаем пытаньне «хто каго» на карысьць сацыялізму ў сельскай гаспадарцы, не гаворачы ўжо аб тым, што ў галіне прамысловасьці мы вырашылі гэта пытаньне канчаткова на карысьць сацыялізму.

Адным з важнейшых і рашаючых паказальнікаў росту сацыялістычных элемэнтаў народнай гаспадаркі зьяўляецца агульны паказальнік суадносін долі агрэгаванага сэктару і прыватнага ў асноўных фондах краіны. На пяцігодцы доля агрэгаванага сэктару ў 1932-1933 г. павінна была складзьці 68,9 проц. усіх асноўных фондаў. У выніку двух год пяцігодкі доля агрэгаванага сэктару ў асноўных фондах павялічылася з 52 проц у 1927-28 г. да 62 проц. у 1929-30 г., а ў 1931 г. доля агрэгаванага сэктару дасягне 70 проц. (69,1) усіх асноўных фондаў.

Што паказваюць прыведзеныя лічбы? Яны паказваюць, што задачу «хто каго» ў галіне прамысловасьці мы ўжо вырашылі, а ў сельскай гаспадарцы мы набліжаемся да яе вырашэньня і 1931 г. будзе годам, у якім мы ў асноўным завершым выкананьне задачы, пастаўленай Леніным,—задачы пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

Гэта і ёсьць паказальнік таго, што мы ня толькі з посьпехам выгрымалі пераходны экзамэн з 3-га на 4-ы курс, але мы ўжо набліжаемся да завяршэньня 4-га курсу, мы набліжаемся да скапчэньня фундаманту сацыялістычнай эканомікі, г. зн. набліжаемся да таго моманту, калі мы будзем непераможнымі. Гэта акрэсьлівае ўсё выкананьне задачы, пастаўленай Леніным—задачы дагнаць і перагнаць капіталістычныя краіны. Мы разгарнулі нячуваную барацьбу за тэмпы. Камсамол быў не апошнім у гэтай барацьбе за тэмпы. Барацьба за тэмпы азначала ня толькі барацьбу з тымі, хто тармазіў гэтым тэмпы, ня толькі барацьбу з правымі ўхілістамі і з троцкісцкімі элемэнтамі, якія ў сваіх поглядах на тэмпы індустрыялізацыі краіны вышліся. Барацьба за тэмпы азначала, што мы яе вялі ў нашым штодзённым жыцьці, у практыцы. Барацьба за тэмпы прасякнула ў глыбіню, у тушчы мас, на кожны завод, у кожны трэст, у кожнае гаспадарчае аб'яднаньне, у кожнае сяло.

Цэнтральны Камітэт партыі ў сваёй барацьбе за тэмпы не абмяжоўваўся агульнымі дырэктывамі, агульнымі ўказаньнямі. Адзначальнай асаблівасьцю работы Цэнтральнага Камітэту зьяўляецца тое, што мы прасякнулі ў глыбіню, у капкрэтныя пытаньні кожнага гаспадарчага аб'яднаньня, кожнага трэсту. Для нас лічбы пяцігодкі, устаноўленыя спачатку, ня былі фэтышам. Гэтыя лічбы зьмяняліся па-ходу па ўсіх галінах прамысловасьці—і па нафце, і па вугалі, і па металю і г. д.

Рабочыя масы зьнізу адгукнуліся на гэта ідэяй сустрэчнага прамфінпляну, якая зьяўляецца ідэяй барацьбы за тэмпы, барацьбы з тымі, хто прабуе спасыланьнямі на труднасьці тармазіць разьвіцьцё прадпрыемстваў, бо мы павінны ведаць, што справа ня толькі ў тым, каб пабудаваць новы завод, а справа ў тым, каб умець рацыянальна выкарыстаць тыя заводы, якія існуюць, рацыянальна выкарыстаць абсталяваньне, рацыянальна выкарыстаць нашы магчымасьці па павялічэньні колькасьці сырцу, па павялічэньні колькасьці металю, вугалю і г. д. Лёзунг, які быў выкінут масамі, лёзунг «Пяцігодка—за чатыры гады»—не фантазія, а рэзультат вопыту мас, рэзультат вопыту нашай партыі, рэзультат вопыту пралетарыяту і селянства. І мы можам сказаць, што гэты лёзунг мы ажыцьцёвім: мы выканаем пяцігодку за чатыры гады (бурныя аплёдысмэнты).

На XVI зьезьдзе партыі т. Сталін указаў, што ні адна краіна ў сьвеце ня ведае такіх шалёных тэмпаў разьвіцьця і росту, як наша краіна, бо наша краіна ўладае тымі ўдзьвісьцісьцямі і пераватамі, якімі ня можа ўладаць капіталістычная краіна. Гэта паказвае той факт, што, ня гледзячы на сыстэматычнае шкодніцтва клясавых ворагаў, ім не ўдалося затармазіць бурны рост сацыялістычнай гаспадаркі, бо ў руках пралетарскай дзяржавы сканцэнтраваны ўсе рэсурсы краіны; мы рэгулюем і плянуем усе галіны народнай гаспадаркі. Калі, напрыклад, да апошняга году мы для сельскай гаспадаркі акрэсьлівалі больш ці менш прыблізныя плыны, калі мы яшчэ не маглі называць поўнасьцю нашы кантрольныя лічбы народна - гаспадарчым плянам, дык апошні пленум Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б), разгледзеўшы кантрольныя лічбы па сутнасьці, ужо назваў гэта народна-гаспадарчым плянам, які акрэсьлівае ход разьвіцьця для ўсіх галін народнай гаспадаркі, у тым ліку і для сельскай гаспадаркі.

Значэньне нашага росту добра разумеюць нашы ворагі. Нашы ворагі разумеюць, што азначаюць рост і разьвіцьцё народнай гаспадаркі ва ўмовах Савецкага Саюзу. Яны ўжо не сьмяюцца з пяцігодкі, як сьмяяліся раней, а яны ўжо, хутчэй, плачуць ад гэтай пяцігодкі, бо яны бачаць, што побач з нашым ростам у іх заняпад.

II. Суадносіны паміж сацыялізмам, які будуецца, і капіталізмам і агульны малюнак сусьветнага становішча

Савецкі Саюз мае вялізарную будучыню. Перад намі вялізарнае поле работы, мы павінны прыкласьці ўсе нашы намаганьні для пасьпяховага завяршэньня нашага будаўніцтва. Павышэньне добрабыту рабочае клясы нашай краіны залежыць ад росту сацыялістычных элемэнтаў народнай гаспадаркі. І гэта добра разумеюць рабочыя, бо, калі-б рабочыя гэтага не разумелі, у нас ня было-б тей хвалі зусім новых форм удзелу мас у сапбудаўніцтве, як сацсяборніцтва і ўдарніцтва, сустрэчны прамфінпляны і г. д., і г. д. Сацсяборніцтва і ўдарніцтва адрозьніваюцца ад іншых форм удзелу мас у сацбудаўніцтве тым, што гэта ёсьць новая гістарычная зьява, якую прадбачыў Ленін, якая, пачаўшыся з паасобных суботнікаў, абярнулася ў масавы рух мільёнаў. Гэта адбываецца таму, што рабочыя разумеюць усё значэньне нашага будаўніцтва для справы сацыялізму, для росту добрабыту рабочай клясы і ўсёй краіны.

І мы, таварышы, можам сказаць, што ў выніку апошніх двух год нашай работы мы маем рост матар'яльнага добрабыту рабочых мас.

У той час, як за мяжою беспрацоўе расьце, у той час, як за мяжою мы зьяўляемся сьведкамі росту галечы мас, мы бачым, што ў нас беспрацоўе амаль зьнікла і матар'яльны добрабыт мас расьце.

Вось артыкул аднаго амэрыканскага пісьменьніка—Тэадора Драйээра. Назва яго «Беспрацоўе ў Нью-Ёрку». Драйээр падае жахлівыя малюнкі беспрацоўя ў Амэрыцы. Паслухайце, што расказвае гэты пісьменьнік.

«Ахвяраваньні і падачкі—вось ўсё, што знаходзяць для армії беспрацоўных людзей, якія могуць і хочуць працаваць і толькі цяпер па віне эканамічнай і сацыяльнай разрухі, створанай самім урадам, ня маюць работы. Але нідзе і ніхто не заікнуўся яшчэ аб пяцідзённым тыдні, які існуе ў СССР, аб увядзеньні 7-мі ці 6-цігадзіннага рабочага дня на якім-небудзь прадпрыемстве ці хаця-б у самых урадавых установах в мэтай памяншэньня беспрацоўя.

Ва многіх раёнах Нью-Ёрку беспрацоўе з усімі яго жудасьцямі моцна ўвайшло ў жыцьцё. У кастрычніку 1930 г. я праходзіў па Боўэры і бачыў маладых хлапцоў і дужых мужчын, якія сядзелі на тратуарах, зьбіраліся вакол вулічных ліхтароў ці спалі па дрыўляных памостах перад складамі. Я заўважыў, што ва многіх з іх барада адрасла на цэлы вяршок. А ў гэтым-жа раёне пагаліцца каштуе ўсяго толькі пятак. Але ў гэтых людзей няма пятака.

Доктар Уайп, які загадвае публічнымі школамі Нью-Ёрку, пацьвярджае, што ў Манхатане, дзе налічваецца 75.000 школьнікаў, хворых на чубэркулёз, дзеці ўсё часьцей і часьцей недаядаюць.

Я-ж хачу сказаць пакуп гэтага наступнае. Народ навінен ведаць, якавы сапраўдныя прычыны цяперашняй дэпрэсіі: лёгка здабытыя грошы, рызыкоўная гульня на біржы і нікім не кантраляванае вытворства і працаа. У сувязі з крызісам трэба было-б скарыстаць многія мерапрыемствы Савецкай Расіі, як, напрыклад, 6-гадзінны рабочы дзень і пяцідзённы тыдзень.

Камунізм? Пагроза нашаму ладу?

Усялякі іншы шлях больш небясьпечны».

Вось як адзін з дробна-буржуазных пісьменьнікаў Тэадор Драйээр расказвае аб становішчы рабочых у Амэрыцы і вось той выхад, аб якім ён баіцца сказаць проста, але да якога ён мімаволі падыходзіць. Бачачы нашы дасягненьні, нашы магутныя дэманстрацыі, нашы ворагі зьдзіўлены. Задавалася-б, у нас-жа труднасьці--скуль-жа бярэцца гэты энтузіязм рабочае клясы, энтузіязм моладзі ў нашай Савецкай краіне? Яны не разумеюць таго, што наш рабочы бачыць і ведае, што будучыня—за ім, што кожны дзень прыносіць яму ўсё новае і новае паляпшэньне. Рабочыя ведаюць, што, колькі працаздольнай моладзі ня будзе прырастаць штогод, яны будуць заняты работай, яны ня будуць у тым жахлівым становішчы беспрацоўных, у якім знаходзяцца рабочыя Англіі, Амэрыкі і Нямеччыны. Яны атрымаюць работу, бо яны ведаюць, што кожны месяц адкрываюцца ўсё новыя і новыя сацыялістычныя фабрыкі, кожны месяц пачынаюць дыміцца ўсё новыя і новыя каміны.

Паляпшэньне матар'яльнага становішча рабочай клясы

Мы маем рост добрабыту рабочай сям'і. Многа ўжо сем'яў, у якіх працуе на 3-4 чалавекі. У нас расьце жыцьцёвае будаўніцтва і ў 1931 г. будзе затрачана 1.100 млн. руб. Расьце фонд сацстрахаваньня, які складзе ў 1931 г. 2.100 млн. руб. Расьце агульны ўзровень матар'яльнага добрабыту рабочых і ў прыватнасьці моладзі. У сувязі з вашым зьездам я напрабаваў праз групу камсамольцаў абсьледаць бюджэты рабочай моладзі. Абсьледавальнікі проста са слоў рабочай моладзі рабілі запісы. Дазвольце падаць з гэтай пачкі абсьледаваньняў некаторыя тыповыя даныя.

«Мосэлектрык». С. В., 18 год, камсамолец, падручны сьлесара. На заводзе працуе адзін год, атрымлівае зараз 100 р., год назад 72 руб. Вечарам вучыцца ў тэхнікуме за кошт заводакіраўніцтва.

Сям'я 4 чалавекі, працуюць 3 чал., агульны заработак—380 руб. Жыцьцёвага 4 саж. Грошы аддае сям'і, накідае сабе 30 руб. Выдаткоўвае іх на членскія ўзносы, на лапярэсы і кіно. Работай задаволены, пэнсіяй таксама.

1-я ўзорн. друкарня. Пераплётны цэх. Е. А., 18 год, б/п, пераплётчык. Працуе 1 год, вучань. 6 месяцаў наназад атрымліваў 30 руб., зараз атрымлівае 75 руб. Жыве самастойна. Плаціць за ложак 15 руб. Вучыцца па прафтэхн. курсах, плаціць заводакіраўніцтва. Вучыцца 4 дні ў тыдзень, рэшту часу—у гурткох. Плаціць у жылкааэратыву для атрыманьня пакою. Заработку хапае, каб пражыць сярэдня, бо ўсё ёсьць у закрытым разьмеркавальніку і сталоўка добрая. Бацькі жывуць у вёсцы. Кватэрныя ўмовы наважныя, але затое скора атрымае пакой. (Сьмех).

Сярод тэкстыльшчыкаў жыцьцёвы ўзровень некалькі ніжэйшы. Вось даныя па фабрыцы «Трехгорной Мануфактуры».

Хлапец-камсамолец, працуе кляймільшчыкам у апальным цэху, работа зьдзельная, заробле 90 руб. у м-ц. 6 месяцаў назад быў простым чорнарабочым, пасьля ўступленьня ў брыгаду заработак павысіўся на 45 проц. Ўвесь свой заработак аддае мацеры і ца мер патрэбны атрымлівае ад яе. Сям'я складаецца з шасьці чалавек. Працуе ў сям'і яшчэ бацька, заробле 100 руб. Нідзе ня вучыцца, тлумачыць, што ячэйка не адпускае. Вечары праводзіць ў клюбе, па сходах, у ячэйцы.

Фабзавучнёўка, працуе ў фарбавальным цэху на джыгах, атрымлівае па стаўцы 21 руб. у месяц з камунальнымі і трамвайнымі выходзіць 36 руб., вучыцца ўжо 3 м-цы. У адной сям'і—7 чалавек. Работнік яшчэ — бацька, атрымлівае 80 руб., працуе тут-жа на фабрыцы. Хацела-б быць інжынэрам-тэкстыльшчыкам, але гаворыць, што ФЗВ закантрактавалася да канца пяцігодкі, што не адпусьціць, а потым пойдзе вучыцца. Пэнсіі не хапае, нават яшчэ бацькі дабаўляюць.

У другой у сям'і 3 чалавекі. Працуе маці, атрымлівае 65 руб., малодшая сястра ходзіць у школу. Праводзіць вечары, «як усе». Скардзіцца, што майстры не дазваляюць самастойна працаваць, а з работнікамі, як з нявольнікамі.

Фабзавучнёўка,. дзержаватая і гаматыстая, сакратар цэхколектыву фабзайчат, атрымлівае 21 руб., жыве з маткай. Усе вечары занята то на сходах, то на работе на пытаньню, як, ці хапае пэнсіі і як разьмяркоўвае свой заработак: рублёў тры ідзе на газэты і кнігі, 15 руб.—на харчы, на адзеньне нічога не застаецца.

Дзяўчына вучыцца 2-гі год, са двароўнага выгляду—любіць адзецца, жыве з бацькамі. Бацька тут-жа працуе сьлесарам, атрымлівае 100 руб. Яна заработак аддае бацьком, на патрэбы атрымлівае ад іх. Пасьля скончэньня фабзавучу думае пайсьці вучыцца на інжынэра-тэкстыльшчыка.

Завод «Динамо». Токар III разраду, 19 год, беспартыйны. Працуе на заводзе 2 гады. Заработак—100 руб., ½ года назад зарабляў 30-40 руб. (вучыўся). Жыве ў сям'і. Сям'я—4 чалавекі. Агульны даход сям'і — 300 р. Кватэра бясплатная. Ня п'е, ня курыць. Грошы аддае бацьку, абедае на заводзе (35 кап. абед). Вучыцца ў цеплатэхнікуме (вечарам). Таму працуе 6 гадзін. Кватэра побач з заводам.

Токар III разраду, 23 гады, член УсеКП(б). Працуе токарам з 1 кастрычніка 1930 г., заробле 85-100 руб. Да гэтага вучыўся ў вучнёўскай брыгадзе, атрымліваў 72 руб. Жыве адзін, паспісае матцы на вёску 15 руб., плаціць за «кут» 17 руб. Вучыцца на рабфаку. Працуе 6 гадзін—калектарныя скрынкі.

Дзяўчына 17 год, вучыцца ў ШУМП, працуе 4 гадзіны, вучыцца 4 гада., жыве ў сям'і. Бацька з сястрой заробляюць 350 руб. Матка на вёсцы, ёй пасылаюць 50-60 руб. у месяц, жывуць у пакоі з вакном у 2 кв. саж.—4 чалавекі. Грошы аддае бацьку. «У кіно хадзіць—грошай шкада, чаму на заводзе кіно не паладзяць?».

Як бачыце, гэтыя даныя зьбіраліся з жывых людзей шляхам апытаньня, без прыфарбаваньняў. Лік гэтых прыкладаў можна было-б значна павялічыць, але і паданага даволі для таго, каб было ясна, наколькі ўзрастае матар'яльны добрабыт нашай рабочай моладзі.

Вядома, побач з фактамі, калі моладзь нядрэнна жыве, дзе матар'яльны ўзровень добры, мы маем факты, дзе яшчэ жыцьцёвы ўзровень невыстарчальны, асабліва ў такіх галінах працы, як тэкстыльная. Больш за ўсё скардзяцца на жыцьцёвыя ўмовы. Але гэтыя даныя, якія я ў тут прадэманстраваў на радзе прыкладаў, паказваюць, як быстра расьце матар'яльны ўзровень нашай моладзі, ня гледзячы на труднасьці нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Параўнайце гэтыя даныя з данымі аб становішчы моладзі на Захадзе, і вы ўбачыце, наколькі малюнак паразьлівы.

Паводле даных Выканкому Камінтэрну моладзі, малады мэталіст у Нямеччыне заробле 12-16 марак у тыдзень, ці 6-8 руб. у тыдзень, і 24-32 р. у месяц. Лодзінскі малады тэкстыльшчык заробле максымум 35 злотых у месяц (каля 8 руб.). Францускі малады рабочы заробле 110-130 франкаў, ці 7-8 руб. у поўмесяца.

Да гэтага трэба дадаць зьніжэньне зарплаты, якое б'е ў першую чаргу па моладзі, 8-3-гадзінны рабочы дзень і нават 12 гадзін, рост беспрацоўя. Так, з сьнежні 1930 г., ня менш 6 млн. прыпых Штатах беспрацоўная моладзь вузэйскіх краінах атрымаўшае дапамогі, а ў эўрада крайніх разьмераў абмежавана.

Паводле афіцыяльных даных нямецкага буржуазнага саюзу моладзі. 40 проц. маладых рабочых працуе 10 гадзін, 30 проц.—9 гадзін. І так у большасьці краін.

Досыць гэтага параўнаньня, каб пераканацца ў росьце дабрабыту рабочых наогул і моладзі ў прыватнасьці ў нас у краіне параўнальна са становішчам рабочых па Захадзе, якое ўсё пагаршаецца. Іменна з прычыны нашых посьпехаў так хвалюцца капіталісты замежных краін, іх вучоныя ідэолёгі.

Трэба адзначыць, што дзякуючы росту гаспадаркі ў нас, асабліва ўзмацнілася цікавасьць да нашай пяцігодкі.

Вы ведаеце, напэўна чытолі артыкул Лейд-Джорджа, у якім ён даваў ацэнку нашай пяцігодкі і нашай палітыкі. У гэтым артыкуле ён падкрэсьліваў нашы дасягненьні і нашу сілу.

У апошнія часы колькасьць дадатніх водзываў аб нашай пяцігодцы значна павялічылася.

Узрастаючы крызіс капіталізму

Мінулыя 10 месяцаў з часу XVI зьезду нашай партыі, на якім быў дан аналіз сусьветнага становішча і крызісу ў капіталістычных краінах, ня толькі не абергі ні аднаго слова з гэтага аналізу, але, наадварот, цалкам і поўнасьцю яго пацьвердзілі.

Вось лічбы за першыя 9 месяцаў 30-га году.

Сусьветная прадукцыя чыгуну бяз СССР папізілася па 16,1 проц., у ПАЗШ—на 21,4 проц., на 22,6 проц. у Нямеччыне. Сусьветная прадукцыя сталі папізілася на 19,3 проц., вугалю—на 8,1 проц., машынабудаўнічая прамысловасьць у Амэрыцы папізілася на 24 проц. па ліцейным абсталяваньні і на 49 проц. па варштатах. Выраб аўтамабіляў у Амэрыцы папізіўся на 36,9 проц. і на 30,8 проц. у Нямеччыне.

Гэты крызіс закрануў таксама і Францыю. Праўда, процант зьніжэньня ва Францыі значна меншы, чым у іншых краінах, але прагноз аб тым, што і Францыя ня ўнікне крызісу, апошнія месяцы разьвіцьця гаспадаркі на Францыі цалкам і поўнасьцю пацьвярджаюць.

Вось ужо паўтара года, як у Амэрыцы бушуе крызіс. Даныя буржуазнага эканамічнага журналу «Аналіст» (так званы індэкс «Аналіста») малюе такую карціну. Здабыта чыгуну ў ліпені 1929 г. выяўлялася павод

Даклад тав. Л. М. КАГАНОВІЧА

«Наша задача — забесьпячэньне ўзятых тэмпаў індустрыялізацыі, бо для ўмацненьня абароназдольнасьці краіны трэба мець ня толькі добра навучаную і стойкую, але і добра «оснащенную» тэхнікай Чырвоную армію, каб яна стала забесьпячэньня ўзятых тэмпаў, без далейшага росту гаспадаркі, без выкананьня пяцігодкі за чатыры гады мы з посьпехам не маглі-б выканаць гэтай задачы.

III. Капіталістычнае акружэньне, труднасьці і задачы сацыялістычнага будаўніцтва

Камуністы-марксысты павінны ўмець аглядаць ясна свае сілы, усе вучасткі фронту, моцныя і слабыя. Мы павінны ведаць сваю сілу, і ня траціць упэўненасьці ў посьпеху нашае справы, але трэба ведаць і свае слабыя бакі, каб яе супакойваць, не адначываць на паўрах, не заражацца фаталізмам, — маю, пабудова сацыялізму ў нашай краіне забясьпечана, — не заражацца самацёкам, а на-бальшавіцку мабілізаваць усе сілы і прыёмы ў рух і баявую гатоўнасьць усе арганізацыі, усе чатары, каб з посьпехам выканаць пастаўленыя задачы, каб і далей ісьці ад перамогі да перамогі. Гэта заўсёды было моцным бокам нашай партыі, і лішкам боязнь выкарыстоўваньня вораганы ніяных памылак, адкрытага выкуленьня іншых недахопаў і труднасьцяй нас не палохала. Ня толькі нашы клясавыя ворагі, але ўнутрыпартыйныя ворожыя ленінізму сілы выкарыстоўваюць малейшыя затрудненьні для таго, каб падрываць палітыку партыі. Мы з гэтым ня лічыліся і ня лічымся. Бо перш за ўсё мы ведаем, што нашы труднасьці вынікаюць з грандыёзнасьці тых задачы, якую мы перад сабой паставілі. Выходзячы з гэтага, трэба ўнядь зусім дакладна сапраўднае становішча рэчаў, каб зразумець, што трэба рабіць.

Нашы тэмпы будаўніцтва перавышаюць тэмпы разьвіцьця любой краіны. Але мы ведаем, як гэта падкрэсьліў т. Сталін на XVI зьезьдзе, што тэмпы нараўнаваны ўзроўню. Мы ведаем, што мы з вамі знаходзімся на больш нізкім узроўні, чым капіталістычныя краіны.

Паступныя лічбы паказваюць ступень нашага адставаньня. Здабыча нафты ў Амэрыцы ў 1929 годзе раўнялася 143 млн. тон: у СССР — 19 млн. тон, а ў 1931 г. — 26 млн. тон. Выпрацоўка энэргіі ў Амэрыцы ў 1929 годзе — 117 млрд. квтг.; у СССР у 1930 г. — 9 млрд. квтг.; а ў 1931 г.— 12 млрд. квтг. Каменнага вугалю здабыта у Амэрыцы 546 млн. тон; в СССР у 1930 годзе — 56 млн. тон, а ў 1931 г. 83,5 млн. тон. Хаця на вугалі мы пераганяем у гэтым годзе Францыю, а на чытуну — Францыю—Англію, але наша адставаньне яшчэ вялікае.

Гэта абавязвае нас, каб мы ўпарта працавалі над тым, каб сапраўды дагнаць і перагнаць гэтыя краіны і перамагчы гэтыя труднасьці. Для гэтага ў адрозьненьне ад капіталістычных краін мы маем шмат пераваг. Капіталістычныя краіны хаця багацей за нас, але іх затрудненьні зьяўляюцца затрудненьнямі дзядулі, які ўжо спарахнеў і пазіраце ў магілу, а нашы затрудненьні зьяўляюцца затрудненьнямі маладога, бадзёрага піянэра - камсамольца, які расьце і цьвіце і дабіваецца таго, каб мы дагналі і перагналі капіталістычныя краіны (бурныя аплёдысмэнты).

Мы павінны мабілізаваць усе свае сілы, каб перамагчы труднасьці. Зьвар немся да нашых працаўных сіл. Першая група труднасьцяй — гэта труднасьці эканамічнага парадку. Мы маем абмежаныя сродкі.

Ні адна краіна не разьвівалася, не расла без дапамогі ў тэй ці іншай форме звонку, г. зн. без крэдыту. Мы-ж знаходзімся ў капіталістычным акружэньні, і нам прыходзіцца разьвіваць толькі ва ўнутраныя рэсурсы.

Мы яшчэ моцна адчуваем патрэбу ўвозу з-за мяжы. Але калі нам прыходзіцца стаяць пытаньне аб увозе, дык мы павінны выбіраць, што ўвозіць. Ці ўвозіць бавоўну для тэкстылю, каб было больш мануфактуры, ці ўвозіць машыны, каб выраблялі машыны ў нас у краіне. Мы спыняемся на ўвозе пераважна машын. Адсюль труднасьці ў разьвіцьці тэкстыльнай і скуранай прамысловасьці, бо ў нас яшчэ адчуваецца нястача сваёй скуры, нястача сваёй бавоўны, хаця мы ў гэтым годзе ўжо зараз загатовілі бавоўны больш, чым за ўвесь мінулы год.

Мы маем зараз труднасьці і ў галіне цяжкой індустрыі. Гэтыя труднасьці зьвязаны з тым, што рацыяналізатарскія мерапрыемствы невыстарчальныя, ня маем досыць кваліфікаваных кадраў, што мы ня маем яшчэ столькі заводаў, якія-б выраблялі патрэбную колькасьць чыгуну. Нашы вугальныя капальні яшчэ не настолькі мэханізаваны, каб павялічыць здабычу вугалю, каб поўнасьцю накарміць нашу прамысловасьць гэтым збожжам—вугалем. Такавы аб'ектыўныя прычыны.

Але, апрача аб'ектыўных прычын, мы павінны тут з усёй сілай ударыць па тых суб'ектыўных прычынах, па тых недахопах нашай работы, якія прыводзяць да таго, што планы зьвяжэньня сабекошту ня выконваецца, якія прыводзяць да таго, што, перавысіўшы лічбы пяцігодкі, праграму гэтага году па вугалі і металі ня выконваем. Рацыяналізатарскія мерапрыемствы надзвычай слабыя. Часта гаворыць: дай нам новую машыну, дай нам новы завод, а стары завод ісьце і яго мала выкарыстоўваюць; арганізатарская работа часта настолькі дрэнная і справу арганізоўваюць так дрэнна, што і новыя заводы выкарыстаць, як сьлед, ня могуць.

Гэта абавязвае нас мабілізаваць свае сілы па тое, каб праграму па вугалі, метале і г. д. выканаць ва што-б там ні стала. Толькі намаганьнямі пралетарыяту, намаганьнямі партыі і камсамолу мы гэтыя затрудненьні зможам перамагчы.

Мы маем затрудненьні і ў транспарце. Транспарт адстаў. Ён гіганцкі вырас у параўнаньні з праграмай, якая памячалася, але ён адстаў у параўнаньні з запатрабаваньнямі, якія яму прад'яўляюць. Ён адстаў і ў сваёй арганізацыі і адстаў у сваім кіраўніцтве. Цэнтральнаму Камітэту прышлося нядаўна шчыльна заняцца пытаньнямі транспарту, і мы ўпэўніліся ў тым, што ў затрудненьнях на транспарце ў большай сваёй частцы вінавата няўменьне арганізаваць справу. У большай сваёй частцы гэтыя затрудненьні залежаць ад таго, што людзі сьляпаліся з усякімі перасадкамі, неабдуманымі рэформамі, ня ўмелі падабраць і расставіць людзей, сваіх людзей. Мы маем справу на транспарце і са сваёзасаблівымі формамі клясавага змаганьня. Кулацкія элементы, якія ёсьць у радох транспартнікаў, прабуюць нам шкодзіць, зрываць нашу работу.

Вось чаму партыйныя арганізацыі, камсамольскія арганізацыі павінны ўзмацніць клясавую пільнасьць, змаганца за працоўную дысцыпліну, за захаваньне паравознага парку, змагацца за беражлівыя адносіны да паравозаў. Вяз гэтага мы, таварышы, ня зможам узьняць на належную вышыню транспарт. ЦК распрацаваў рад мер, і мы думаем, што камсамол нас у гэтых мерах, у справе змаганьня за паляпшэньне транспарту, актыўна падтрымае (аплёдысмэнты).

Вашы аплёдысмэнты паказваюць, што вы з гэтым згодны. Але я павінен сказаць, таварышы, што калі ў іншых галінах гаспадаркі нашы ячэйкі партыі і камсамолу працуюць надрэнна, дык на транспарце як работа партыйных арганізацый, так і работа камсамольскіх і асабліва прафсаюзных ідзе вельмі дрэнна. Барацьба за дысцыпліну, барацьба за правядзеньне ў жыцьцё дырэктыў партыі на транспарце слабая. Вось чаму мы патрабуем ад партыйных арганізацый, ад камсамольскіх і ад прафсаюзных сапраўды бальшавіцкай работы для таго, каб транспарт пачаў крацаваць па-новаму і задаволіў патрэбы народнае гаспадаркі.

Камсамол ў сацыялістычным будаўніцтве

У справе ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве камсамол мае значныя дасягненьні. Камсамол правяў ініцыятыву ня толькі ў першы пэрыяд разьвіцьця ўдарнага руху, але і ў далейшым камсамол адыграў вялікую і сур'ёзную ролю.

Давяльце расказаць аб тым, як камсамольцы на паасобных вучастках нашай будоўлі ператвараюць працу ў справу гонару і адвагі, могаць камсамольская літаратура т. Галіна, які пабываў на новых набудовах і сабраў рад цікавых фактаў з жыцьця набудоў па спэцыяльным маім даручэньні.

Вось карціна Трактарабуду ў Харкаве:

«У кастрычніку 1930 г. на Харкаўскім трактарабудзе быў прарыў. Трэба было прарвацца і да зімы забетанаваць вялізны мэханічна-зборачны цэх, даўжынёю ў 456 мэтраў. Былі расхістаны мэханізмы і людзі. Лятуны кідалі будоўлю ў самыя адказныя дні. Партыйныя і камсамольскія камітэты абвясьцілі штурмавыя ночы. Павольна разгортвалася змаганьне за бетанаваньне 8-га вучастку Брыгады старых будаўнікоў-бетоншчыкаў — Марусіна, Асокіна, Місціна — першыя навялі штурм ночнадах. Тады-ж быў арганізован камсамольскі батальён чырвонагвардэйцаў пяцігодкі. У штурмавыя ночы, калі трэба было забетанаваць 107 кустоў, іх пашэф камсамолец Голубеў. Яны узьнялі на рыштаваньні, але дошкі былі расхістаны, і некаторыя нават упалі ўніз. Гэта ня спыніла іх. Яны зноў узьнялі і не пакідалі рыштаваньняў гігацкага цэху да тэй мінуты, пакуль ня быў забетанаваны апошні куст. Многія заставаліся спаць тут-жа ля рыштаваньняў, каб у любую мінуту прыйсьці на дапамогу. Іх шмат, каб ішлі адначываць, але батальён застаўся на рыштаваньнях. Досыць сказаць, што яны пацярпелі за сабой старых, што ўпачы калі былі ўзарваны правады і пагасла сьвятло, старыя Марусін Асокін і камсамольскі батальён засталіся да золадку, каб скончыць залівадь бэтонам цэх. Вось прамова пасьля скалчэньня бэтанаваньня камандзіра батальёна камсамольца Голубева.

«Калі быў выяўлен прарыў, мы арганізавалі ўдарны камсамольскі батальён. 60 чалавек маладых чорнарабочых. Прараб Куліпін 19 чысла паказаў нам як трэба бэтанаваць і пайшоў на работу. У першы-ж дзень здарылася няшчасьце: 6 чалавек паляцела ўніз. Хлопцы пацярпелі, але гэта не пахіснула батальён. Наадварот, было зробле на 48 замесаў. Напор быў вялікі, мы пачалі павялічваць прадукцыйнасьць працы і дабіліся 120 замесаў у дзень. Дзяўчаты былі прыкладам ударнай работы. Раніцою быў дождж, але ніхто не хацеў пакінуць работу. Калі апошняя балькі трэба было бэтанаваць, упачы бэтон перавозілі бочкамі, насілі вёдрмі, абы хутчэй скончыць. 5-га кастрычніка, калі сьвятло пагасла, рабочыя не пакінулі работу. Батальён паказаў, як трэба біцца за тэмпы (аплёдысмэнты).

Камсамолка Палякова ярка падкрэсьліла значэньне штурмавых начэй:

«Я хочу сказать, що дивчата не видстали вид того витра, який кружив на 8-й деляци; вони не видстали вид будивництва, яке делось на 8-й деляци.

В штурмовую ничь як один группа Поляковой не сходила 4 доби в механичного цеху.

Дивчата моей группы святкували раніш рождество, пасху та инши святка, але такога свята, як закончине механичного цеха, воны николе не почували».

Паслухайце, далей, як працавалі на Магнітабудзе. Улетку бягучага году на Магнітабудзе адчуваўся голад у рабочых. Адны прыяжджалі і літаральна столькі-ж ад'яжджала назад. Партыйная арганізацыя парашыла набудаваць гэрбля ня зімы. Пастаноўлена было: гэрбля павінна быць набудавана 10 лістапада, такава павінна быць воля ўсіх удзельнікаў набудовы гэрбля» (з адозвы парткому).

Амэрыканцы давалі на пабудову 156 дзён, не-ж пабудавалі за 70 дзён. У гэтым змаганьні за гэрбля паказалі сябе маладыя ўдарнікі Захараў, Плаесьцінкін і інш.

Многа старопак гераізму ўпісалі маладыя камсамольцы ў кнігу змаганьня на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

На металюргічным заводзе імя Сталіна (Ленінград) выкананьне праграмы 2-га году пяцігодкі знаходзілася пад пагрозай. Тады камсамольцы парашылі арганізаваць ударную брыгаду на выпуску 11-тысячнай паравой турбіны раней тэрміну, вызначанага заводзкіраўніцтвам, на 10 дзён. Працуючы ўдарнымі тэмпамі круглыя суткі, ня выходзячы з цэху, камсамольцы выпусьцілі турбіну ва ўстаноўленыя імі самімі тэрміны, тым самым далі магчымасьць заводу ня толькі выканаць, але і перавыканаць прымфіплян.

Я-б мог падаць многа фактаў з Маскоўскай вобласьці, але па скромнасьці сваёй, як мясцовы маскоўскі работнік я ўзяў факты з іншых абласьцей. (Сьмех) Я-б мог у прыватнасьці паказаць на гераізм камсамольцаў Падмаскоўнага басэйну. Маскоўскі камітэт партыі мабілізаваў у Падмаскоўны басэйн 1.000 камсамольцаў, але знайшлося добраахвотнікаў 1.150 чал. Камсамольцы, якія прышлі з гораду і ніколі не бачылі капальні, вядуць сябе там гераічна. Яны арганізуюць ударныя брыгады, цягнуць і вядуць за сабою іншых гарнякоў. Дэзэртыраў, лятуноў камсамольцаў у асноўнай сваёй масе няма. Як яны былі пасланы ў Падмаскоўны басэйн, так яны і засталіся там і вядуць пасьпяховую работу на вугальным фронце, на важнейшым фронце цяперашняга пэрыяду. (Аплёдысмэнты).

Я падаю факты дадатныя. Але ёсьць факты і адмоўнага парадку. Возьмем напрыклад, Сталінградзкі завод. Мы пабудавалі Сталінградзкі завод, лепшыя машыны там паставілі, але машыны гэтага заводу не даюць пакуль яшчэ поўнасьцю тэй прадукцыі, якая нам патрэбна. Чаму?

Вядома, які-небудзь правы ўхіліст ці хто-небудзь з прадстаўнікоў правага «лявацкага» блёку Сырцова-Ламінадзэ, схільны бачыць правал нашай будоўлі. У сапраўднасьці-ж мы маем канкрэтны выпадак, калі не хапіла ўменьня арганізаваць. І камсамольцы гэтага заводу, якія складаюць большасьць рабочых, ня здолелі знайсьці гое зьяво, за якое трэба ўхапіцца, ня здолелі канцэрэтна падыйсьці да недахопаў, каб завод выцягнуць і вывесьці на шырокую дарогу. Цэнтральны Камітэт партыі паслаў туды групу людзей, і мы ўпэўнены, што Сталінградзкі завод у гэтым годзе сваю праграму ў 40-45 тыс. трактараў выканае з посьпехам. Практыка Сталінградзкага заводу нам паказвае, што ў нашых труднасьцях многае залежыць ад таго, як арганізаваць гэту справу. І калі камсамол многае зрабіў у арганізацыі ўдарных брыгад, правяў многа гэраізму, то на часьці глыбокага веданьня справы, уменьня, якасьці работы, — тут камсамол яшчэ далёка на ўсё зрабіў. Пачатак ёсьць. На радзе заводаў камсамольцы многа і многа робяць у галіне рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, але гэта пакуль што паасобныя, адзінкавыя групы. Вось чаму я думаю, таварышы, што ваш зьезд павінен пытаньне аб удзеле камсамолу ў гаспадарчым будаўніцтве на заводзе, у трэсьце, гаспадарчым аб'яднаньні, у цэху, у брыгадзе ўзьняць на новую ступень, на большую вышыню. Камсамольцы павінны вывучаць канкрэтную рэчаіснасьць, факты, тэхніку, праводзіць рацыяналізатарскія мерапрыемствы, умець ня толькі крытыкуць, але дабіцца таго, каб умець ажыцьцяўляць свае-ж уласныя прапановы, умець браць ня толькі гераізмам, але і веданьнем справы. Што камсамол можа гэта зрабіць, аб гэтым гаворыць рад фактаў.

Я прасіў т. Кіша — аднаго камсамольскага літаратара — асьвятліць пытаньне аб тым, як моладзь заваёўвае тэхніку. Ён спэцыяльна абсьледаваў днепрапятроўскія заводы і вось што там выявіў:

«Устаноўлена, што ад 25 да 40 проц. хлапцоў, скончыўшых фабзавуч, прасоўваюцца далей па лініі вучобы і запаўняюць ВНУ, галоўным чынам, вячэрнія. Гэта зусім зьмяніла аблічча маладога кваліфікаванага рабочага. Адной нагой ён стаіць на заводзе другой — у ВНУ. У ім сьпее інжынэр. Праслойка рабочых — патэнцыяльных інжынэраў — зрабілася цяпер масавай. Рабочага-студэнта можна спаткаць пад любой доменнай печкай, ля любога мартэна, ля любога варштату. Людзі на 8 гадзін працуюць ля варштату, а потым на 5-6 гадзін ідуць у ВНУ. Не адыходзячы ад варштату, яны, такім чынам, робяцца інжынэрамі. На трэці год вучобы яны ўжо пачынаюць прапаваць па тэхнічнай спэцыяльнасьці.

Рабочыя - студэнты — гэта адна з лепшых частак камсамолу але адносіны да іх, на жаль, не заўсёды добрыя. Аб маладых спэцыялістах. Гэта праслойка яшчэ ня так вялікая, але ўжо ня так малая. Выключна цікавае становішча мы маем на заводзе імя Дзяржынскага. Ня так даўно, у 1926 г., прышоў туды першы камсамолец-інжынэр. Гэта было вялікай падзеяй, аб якой з захапленьнем пісалі нашы газэты. Панаваўшая там каста шкодзікаў гнала гэтага камсамольца з месца на месца, як зацкаванага зьвера, і не дапускала да работы. Што-ж здарылася за гэтыя гады? Там ужо цяпер маладыя спэцыялісты поўнасьцю замянілі старых у гарачых цэхах. З 350 інжынэраў заводу імя Дзяржынскага толькі адзін з дарэвалюцыйным стажам у гарачых цэхах. Усе іншыя — маладыя савецкія інжынэры, з іх ня менш паўсотні камсамольцаў. Там ёсьць камсамолец — начальнік цэху, там камсамольцы — начальнікі доменных печак.

Так працуюць іншыя атрады камсамолу. Калі-ж увесь камсамол разгорне работу, дык мы дамо павялічэньне прадукцыі на новых і старых заводах.

Дзеля гэтага мы павінны ўзьняць роль камсамолу ў справе заваяваньня тэхнікі, аўладаньня мэханізмамі нашай будоўлі.

Само сабою зразумела, што камуністы і камсамольцы не павінны пры гэтым адрывацца ад палітыкі. Ясная справа, што камсамолец павінен удзельнічаць на сходах, павінен удзельнічаць у практычнай рабоце. Але трэба даць магчымасьць вучыцца, вучыцца і яшчэ раз вучыцца. Толькі тады нашы камсамольцы сапраўды будуць расьці як сапраўдныя будаўнікі сацыялістычнага грамадзтва, як сапраўдны будаўнікі камунізму. Вы, таварышы камсамольцы і піянэры, папаўна дажывеце да камунізму. Камсамольцы і піянэры павінны быць найбольш актыўнымі будаўнікамі камуністычнага грамадзтва (бурныя воплескі).

Многа цікавага дае камсамол і на вёсцы.

Калі абвастрылася клясавае змаганьне ў вёсцы, многія думалі, што з камсамолам на вёсцы ня ўсё будзе добра, бо камсамол у большасьці сваёй быў сялянскай арганізацыяй (у камсамоле было 37 проц. рабочых, а рэшта — сяляне). Некаторыя думалі, што вылучацца такія групы, якія будуць ісьці супроць нас у клясавым змаганьні супроць кулака. Асабліва паконт гэтага паклёпнічала анархіцы.

І вось сёньня мы можам сказаць, што ў тым змаганьні, на тым фронце, які мы мелі на вёсцы, камсамол у асноўнай сваёй часьці аказаўся на вышыні свайго становішча, і палітычныя задачы, якія партыя перад ім ставіла, выканаў.

Камсамол быў сапраўды памочнікам у нашым будаўніцтве.

У тых вёсках, дзе ня было парт'ячэек, камсамол адыгрываў ня толькі ролю памочніка, выканаўцы, але ён адыгрываў ролю застрэльшчыка ў змаганьні за калгасы, ён адыгрываў ролю застрэльшчыка за ліквідацыю кулацтва як клясы. Зразумела, камсамол на вёсцы мае і шмат недахопаў, і адным з рашаючых яго недахопаў зьяўляецца невыстарчальная культурнасьць, невыстарчальнае ўменьне ўдзельнічаць у рабоце саветаў, у рабоце калгасаў. Але ўжо ў калгасах, саўгасах камсамол адыгрывае буйнейшую ролю.

Некалькі дзён назад я склікаў нараду 30 камсамольцаў — дэлегатаў маскоўскай абласной канферэнцыі, дзе былі рабочыя ад варштату і тавары ў калгасаў. І вось там выступіў камсамолец тав. Фядотаў, якому 20 год. Ён зьяўляецца старшынёю сельсавету, старшынёю калгасу і сакратаром ячэйкі камсамолу. Гэта—тып арганізатара сацыялістычнай вёскі.

Даводзі паглядзець на аднаго гэтага Фядотава, каб убачыць, якая армія расьце на вёсцы. Гэта — той камандны склад, які забясьпечыць сацыялістычную перабудову нашай вёскі. (Бурныя аплёдысмэнты).

Яшчэ раз падкрэсьліваю, што ня трэба заналта захаляцца гэтым ростам камсамолу на вёсцы

Калі я езьдзіў на Сібіры і ЦЧВ, а ў аднэй з абласьцей быў са мной і тав. Косараў, мы сабралі групы камсамольцаў. Хлопцы бязумоўна добрыя. Калі кулакі падбухторвалі сялян разабраць коняй з калгасу, яны тут-жа сядаюць на коняй і зьбіраюць беднату. Наогул вязвалі хлопцы за калгасы. У гутарцы мы спыталі аднаго, што такое УсеЛІСМ. Ён стаіць і думае, а потым гаворыць: «Усесаюзная камуністычная партыя». «А што такое савецкая рэспубліка, якое не адрозьненьне ад дэмакратычнай рэспублікі?» «Ды, так, — гаворыць, — рэспубліка, адным словам, народ». Яму цяжка гэта растлумачыць. Ён вакоў за савецкую рэспубліку, ён яе адчувае душой, але ён яшчэ сыры, а ад яго патрэбен зараз ня толькі энтузіязм, але і актыўная будаўнічая работа. Возьмецё калгасы, напрыклад. У нас ёсьць калгасы, дзе ўжываецца ядоцкі прынцып разьмеркаваньня. Працаваў, не працаваў, усё роўна яму выдаецца па колькасьці едакоў. Гэты прынцып прыводзіць да таго, што калгас слабы, як вытворчая адзінка, у калгасе няма зьнітаваньня, няма той дысцыпліны, якая-б забясьпечыла квітненьне калгасу. Таму я зварачаюся да гарадзкіх камсамольцаў: ваша шэфства над вёскай не абмяжоўвайце музыкай, паездкай ва ўрачыстыя дні. Няхай кожная гарадзкая ячэйка прымацуе да сябе пясковую і адказвае за яе, няхай кожны вясковы камсамолец будзе ня менш разьвіт, чым камсамолец гораду, тады мы быстра перабудуем вёску.

Аб труднасьцях і аб уменьні арганізаваць работу

У перамаганьні труднасьцяй нашага будаўніцтва вялізарнае значэньне маюць пытаньні арганізацыйнага парадку. Часта сустракаецца няўменьне арганізаваць работу, няўменьне арганізаваць актыўнасьць мас і падабраць кадры. Само сабою зразумела, што за гады рэвалюцыі мы з вамі гіганцкі вырасьлі. Мы ўмеем арганізоўваць мільёны. Але наша ўменьне трэба вымяраць не абсалютна, а адносна і параўнальна з тымі патрабаваньнямі, якія нам прад'яўляюцца з кожным годам. Мы павінны так паставіць сваю арганізатарскую работу, каб яна надмацоўвала палітыку, каб яна праводзіла ў жыцьцё дырэктывы, якія мы даём. А між тым гэтага ў нас на цяперашні стадыі не заўсёды хапае.

Возьмем самыя вострыя пытаньні — пытаньні забесьпячэньня і работы капэрацыі.

Што-ж выяўляецца? Выяўляецца тое, што дырэктывы партыі выконваюцца яшчэ кепска. Наяўныя тавары, а іх у нас ня так мала, мы ня ўмеем яшчэ, як трэба, выкарыстоўваць. Казаўваецца, што гэтыя тавары затрымліваюцца і трапляюць на туды, куды трэба. Аказваецца, што ікоднікі засылалі тавары ў раёны, ня тыя, якія ім патрэбны.

Роля камсамольскіх ячэек у каапэрацыі, у органах забесьпячэньня надзвычай вялікая. Камсамольцы арганізуюць лятучыя брыгады. Даскапала. Але-ж у вас ёсьць ячэйкі ў гэтых органах. Трэба ўзмацніць іх работу і пільнасьць. Камсамол павінен прапікаць ва ўсе поры, ва ўсе шчыліны, быць сапраўды вокам, памочнікам партыі, каб бачыць усе недахопы, якія ёсьць, і своячасова сыгналізаваць аб іх. Трэба ўсьвядоміць, што рашаючым зьяўляецца зараз уменьне арганізаваць работу зьверху да нізу па практычным ажыцьцяўленьні нашых пастаноў. На рабочых канферэнцыях г. Масквы я падаваў рад прыкладаў, якое няўменьне арганізаваць ёсьць уніз. Вось мы даем указаньне — арганізуй разьмеркавальнік, а прыходзіш у разьмеркавальнік і бачыш, што там чорт ведае што робіцца, рабочыя лаюцца, бо дрэнна арганізавана справа. І гэта адбываецца таму, што рэвалюцыю прымаюць, а вось залезьці ў разьмеркавальнік, у склад, над палічу, паглядзець, як там хаваюцца тавары, бульба, ці не засьмярдзела рыба, як яе выдаваць, каб рабочы без чаргі атрымаў прадукты, — вось гэтай справай займаюцца мала.

Трэба ўсёму скарыстаць ініцыятыву масы. Самакрытыка ў нас разгарнулася як ніколі. Задача наша, аднак, заключаецца зараз у тым, каб мы здолелі ўсе прапановы, якія ідуць па лініі самакрытыкі, канкрэтна ператварыць у жыцьцё.

Часта сакратар ячэйкі, сакратар камсамолу, старшыня заўкому выстаўляюць папаказ свае дасягненьні ў гэтай галіне: «У нас, — гаворыць адзін, — на заводзе тысяча прапалоў паступіла». Другі гаворыць — 1.300, трэці гаворыць —у мяне 1.500. А пытаньне ўсё заключаецца ў тым, колькі прапалоў праведзена ў жыцьцё і як яны праведзены. Лятаюць на ўсіх цэхах, як быццам сьляпацца кудысьці, замест таго, каб узяць адзін цэх, адну групу і правесьці там работу да канца, а потым рушыць далей.

Палітыка заключаецца ў тым, каб не тварыць ня толькі ў рэзалюцыях (рэзалюцыі — рэч добрая, ідэйная чыстата патрэбна, змагацца за яе трэба). Але мы разьбілі правых, трэба з імі змагацца і далей, трэба быць пільнымі, але трэба барацьбу з правым апартунізмам перанесьці ў штодзённае жыцьцё, у штодзённую практыку, павесьці барацьбу з няўменьнем працаваць, падшукаць людзей і кадры, і ўзьнімаць іх на ўсё большую і большую вышыню і арганізоўваць масы вакол канкрэтных задач.

Пытаньне аб кадрах — адно з цэнтральных пытаньняў. Цэнтральны камітэт партыі гэтаму пытаньню аддаваў выключную ўвагу. У нас зараз вучацца сотні тысяч таварышоў. Вялізарная маса моладзі. Пытаньне тут у тэмпах вучобы і ў якасьці. Трэба, каб інжынэр, які выйдзе з ВНУ, быў сапраўдным інжынэрам, а не «чалавекам з дыплёмам». Нам дыплёмаваных інжынэраў без ведаў ня трэба. У нас ня маменькіны і ня папенькіны сынкі, якія дабіваюцца атрымаць дыплём, нам патрэбен інжынэр, які ўмее арганізоўваць вытворства. І тут камсамол павінен адыгрываць вялізарную ролю. Праблема кадраў для камсамолу, падрыхтоўка кадраў, выхаваньне іх ва ўсіх галінах работы—пачынаючы ад гаспадарчых установ і канчаючы заводам, цэхам — зьяўляецца адзінай з цэнтральных задач. Піянэры, вучаўся ў школах, прымаюць тым самым удзел у сацыялістычным будаўніцтве. Задача ў тым, каб падрыхтаваць новага чалавека і ідэйна і тэхнічна ўзброенага ведамі. Падрыхтоўцы кадраў трэба аддаць вялізарную ўвагу. У нас растуць маладыя кадры, ім трэба даць адпаведныя веды. Уладу мы заваявалі, і я думаю, што кожны камсамолец упэўнены ў тым, што тэтай улады ніхто ў нас назад не забярэ. (Аплёдысмэнты).

Цэнтральная задача заключаецца ў тым, каб умець гэту ўладу найлепш арганізаваць, найлепш скарыстаць. Для гэтага патрэбны новыя людзі, новыя кадры. Камсамол павінен падрыхтаваць кадры для сябе, для сваёй работы, у асаблівасьці для вёскі. Але з асяродзіпча камсамолу мы павінны чэрпаць кадры для дзяржапарату і гаспадарчага будаўніцтва. Мы маем сярод камсамольцаў шмат здольных, таленавітых арганізатараў, якіх можна паставіць намочнікамі дырэктараў, членамі праўленьняў, а потым яны пойдуць і далей. У асаблівасьці гэта адносіцца да калгасаў і саўгасаў, дзе нашы кадры яшчэ вельмі слабыя. Камсамол павінен прыняць больш актыўны ўдзел ва ўсёй рабоце на палепшаньні дзяржапарату, па выкарчоўваньні ўсяго гнілога, што затрымалася ў павсобных уго зьвеньнях, і замене новымі, жывымі людзьмі. Вось зараз ідуць перавыбары саветаў. Партыя паставіла задачай правесьці перавыбары саветаў такім чынам, каб яны паслужылі штурмком да карэннага палепшаньня работы саветаў і дзяржапарату, да павароту саветаў тварам да калгасаў, тварам да вытворчасьці, да таго, каб саветы сталі на чале сацыябарніцтва і ўрбаніцтва. Ва ўсёй гэтай перавыбарчай кампаніі камсамол павінен адыграць ролю ня толькі як сілы, якая дапамагае партыі арганізоўваць масы, але і як арганізацыі, якая можа вылучыць сотні і тысячы маладых здольных рабочых і калгасьнікаў у саветы. І камсамол, які мае 8 мільёны, а піянэрская арганізацыя 4 мільёны — 7 мільёнаў чалавек, вось гэта тая армія, якая будзе будаваць камунізм, вось гэта тая армія, якая павінна дапамагчы і дапаможа партыі быстрай дагнаць і перагнаць капіталістычныя краіны. (Аплёдысмэнты).

IV. Масавая работа, камсамол і партыя

Нашы труднасьці зьвязаны з абвастрэньнем клясавага змаганьня. Вы ведаеце, што на гэтым пытаньні, па карэнным пытаньні рэвалюцыі — аб вызначэньні клясавых суадносін сіл у краіне — ці ідзе абвастрэньне клясавага змаганьня, ці трэба змагацца з кулаком ці ня трэба — па гэтым пытаньні правыя апартуністы пропаведавалі лібэральную, немаркасьцкую, пяленінскую лінію. Мы бачым на прыкладзе «прампартыі», кулацкай партыі меншавіцкіх арганізацый, як пры падтрыманьні сусьветнага капіталізму гэтыя людзі стараліся сарваць сацыялістычнае будаўніцтва. Вось чаму мы пры перамаганьні нашых труднасьцяй павінны граўляць асаблівую клясавую пільнасьць, мы павінны змагацца за чыстату ідэалёгіі. Выхаваньне рабочае масы, выхаваньне калгасьніка з пункту гледжаньня клясавай пільнасьці зьяўляецца важнейшым пытаньнем.

Ленін на III зьезьдзе камсамолу разгарнуў шырокую праграму выхаваньня моладзі. Ён гаварыў у 1920 г.:

«Мы ня верылі-б вучэньню, выхаваньню і асьвеце, калі-б ліно было загнана толькі ў школу і адарвана ад бурнага жыцьця. Пакуль рабочыя і сяляне застаюцца прыпечанымі памешчыкамі і капіталістамі, пакуль школы застаюцца ў руках памешчыкаў і капіталістаў, пакаленьне моладзі застаецца сьляпым і цёмным.

А наша школа павінна даваць моладзі асновы ведаў, даваць уменьне выпрацоўваць самім камуністычныя погляды, павінна рабіць з іх асьвечаных людзей. Яна павінна за той час, пакуль людзі ў ёй вучацца, рабіць з іх удзельнікаў барацьбы за вызваленьне ад эксплёататараў.

Камуністычны саюз моладзі толькі тады апраўдае сваю назву, што ён ёсьць саюз камуністычнага маладога пакаленьня, калі ён кожны крок свайго вучэньня, выхаваньня, асьветы будзе зьвязваць з удзелам у агульным змаганьні ўсіх працоўных супроць эксплёататараў».

На працягу 10 год камсамол ажыцьцяўляў заветы Леніна, ён вучыўся, ён, вучачыся, змагаўся, змагаючыся, вучыўся. Ён вырас у шматмільённую арганізацыю і вырас ня толькі колькасна, але і якасна.

І як далёка наш камсамол адышоў ад высунутай у свой час тав. Бухарыным задачы, «цэнтральная», барацьбы з курэньнем, прыпчапляючы камсамолу цікавасьць да літаратуры пат-пінкертонаўскага характару! «Патос» барацьбы з курэньнем, «патос» пат-пінкертонаўскай літаратуры замецены сапраўдным патосам рэвалюцыйнай рамантыкі змаганьня за тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва. Заклік да разьвіцьця цікавасьці да пат-пінкертонаўскай літаратуры павінен быць заменены заклікам да вывучэньня кантрольных лічбаў, да вывучэньня пяцігодкі. Да рэчы, і аб пяцігодцы ёсьць ужо кнігі, якія чытаюцца як лепшая рамантычная літаратура, як, напрыклад, кніга Ідьліна аб пяцігодцы. Гэта—лепшая, захапляючая кніга, у якой камсамолец бачыць, як мы расьцём, якія незьлічаныя багацьці ў нас ёсьць і якія надзвычайныя, грандыёзныя пэрспэктывы адкрываюцца перад нашай краінай, перад кожным рабочым і селянінам. Тав. Сталін яшчэ ў 1925 г. ставіў задачу выхаваньня моладзі як задачу падрыхтоўкі байцоў за перамогу сацыялізму ў нашай краіне.

«А што значыць выхоўваць моладзь у духу ленінізму? Гэта значыць, па-першае, укараніць у ёй сьвядомасьць таго, што перамога сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне магчыма і неабходна. Гэта значыць, па-другое, умацоўваць у ёй упэўненасьць у тым, што наша рабочая дзяржава ёсьць дасьпітка міжнароднага пралетарыяту, што яна ёсьць база разгортваньня рэвалюцыі па ўсіх краінах, што канчатковая перамога нашай рэвалюцыі зьвязаецца справай міжнароднага пралетарыяту. Гэта значыць, па-трэцяе, выхаваць моладзь у духу давер'я да кіраўніцтва (расійскай) камуністычнай партыі. Трэба стварыць у камсамоле такія кадры і такі актыў, якія маглі-б правесьці выхаваньне моладзі ў гэтых імённа напрамках.

Камсамольцы вядуць работу ва ўсіх галінах будаўніцтва: у прамысловасьці, у сельскай гаспадарцы, у каапэрацыі, у саветах, у культурна - асьветных арганізацыях і г. д. Трэба, каб кожны камсамолец - актывіст зьвязваў сваю штодзённую работу ва ўсіх галінах будаўніцтва з пэрспэктывай пабудовы сацыялістычнага грамадзтва. Трэба, каб ён умеў весьці сваю штодзённую работу ў духу і напрамку ажыцьцяўленьня гэтай пэрспэктывы». (Сталін. «Пытаньні ленінізму», стар. 291).

(Працяг у наступным нумары)

ПАСТАНОВЫ ПР

ДРУГІ ДЗЕНЬ ВЫБАРАЎ У МЕНГАРСАВЕТ

Пралетары г. Менску паказваюць прыклады высокай палітычнай актыўнасьці і клясавай сьвядомасьці

РАБОЧЫЯ ЗАВОДУ „КАМУНАР“ І ЦЯГНІКОВЫХ БРЫГАД УСЕ, ЯК АДЗІН, ЗЬЯВІЛІСЯ НА ВЫБАРЧЫЯ СХОДЫ

Пасылаючы ў гарсавет загартаваных барацьбітоў-ударнікаў, перадаючы ў рады КП(б)Б сваіх лепшых прадстаўнікоў,—рабочыя галасуюць за генэральную лінію партыі, за ачышчэньне гарадзкога савету ад апартуністычных, прымірэнчых і бюракратычных элемэнтаў.

Т. т. СТАЛІН І МОЛАТАЎ—ГАНАРОВЫЯ ЧЛЕНЫ МЕНГАРСАВЕТУ

Справаздачная кампанія Менгарсавету, выкрыўшая апартуністычную практыку мінулага кіраўніцтва гарсавету, адставаньне яго ад тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, у той самы час выявіла няўхільнае імкненьне рабочых Менску дапамагчы перабудове работы гарсавету, ачысьціць яго ад апартуністаў і прымірэнцаў, узмацніць гарсавет лепшымі ўдарнікамі, загартаванымі ў баёх за прамфінплян.

Хваля актыўнасьці мас асабліва высока ўзьнялася ў часе перавыбараў.

Другі дзень перавыбарчай кампаніі—21 студзеня—прайшоў пад знакам выключна высокай палітычнай актыўнасьці і клясавай сьвядомасьці мас выбаршчыкаў. На выбарчых сходах разгарнулася нячуваная творчая ініцыятыва рабочай клясы.

Першае месца па актыўным удзеле выбаршчыкаў занялі завод «Камунар» і цэх цягніковых брыгад Менскага вузла. На сход рабочых чырвонасьцяжнага «Камунара» зьявіліся ўсе 100 проц. выбаршчыкаў. Яўка на сход цягніковых брыгад Менскага вузла перавысіла ўсе меркаваньні — рабочыя проста з работы, з дарожнымі куфэркамі і інструмантамі зьявіліся на выбарчы сход, каб заявіць аб сваіх патрабаваньнях да новага складу гарсавету. Прышлі і тыя, хто знаходзіўся ў адпачынку.

На сход будаўнікоў заяўведу прышло 98 проц. рабочых.

На радзе прадпрыемстваў сходы ператварыліся ў вялікую дэманстрацыю адданасьці рабочых мас генэральнай лініі партыі. Новыя атрады баявых актывістаў, кадравых пралетараў уліліся ў рады партыі. Месца ўдарнікам у радах ленінскай гвардыі,—гаворыцца ў шматлікіх заявах, паданых у бюро заводзкіх партакалектываў. На заводзе «Камунар» 96 рабочых-ударнікаў заявілі аб сваім жаданьні ўступіць у партыю. На сходзе рабочых цягніковых брыгад 15 чыгуначнікаў з вялікім вытворчым стажам падалі заявы ў партыю, на заводзе «Ударнік» паступіла 10 заяў і г. д.

Абгаварэньне наказу праходзіць ва ўмовах вялікай актыўнасьці выбаршчыкаў. Баявое запатрабаваньне пралетараў Менску да новага гарсавету — ісьці ў нагу з тэмпамі сацыялістычнага наступленьня, кіраваць баямі рашаючага году.

Дэпутатамі ў гарсавет, амаль усюды выбраны рабочыя - ўдарнікі з вялікім вытворчым стажам, якія давялі сваё ўменьне змагацца за сацыялізм.

Пасылаючы ў гарсавет сваіх лепшых прадстаўнікоў - ударнікаў, папаўняючы рады партыі выпрабаванымі пралетарамі, рабочыя г. Менску галасуюць за генэральную лінію партыі, за бязьлітасную барацьбу з усякімі ўхіламі ад яе.



Рабочыя заводу «Бальшавік» ідуць на перавыбарчы сход.

За ударны гарсавет

За бальшавіцкія тэмпы—галасавалі „Камунараўцы“

т. Гей—на сходзе рабочых „Камунара“

Гарніст зайграў збор. Тысячная калёна дэманстрантаў пад гукі аркестру вышла з варот заводу «Камунар».

Чырвонасьцяжны «Камунар» праводзіць выбары ў гарадзкі савет.

Лёзунгі, плякаты над галавамі дэманстрантаў крычаць аб гэрайчнай барацьбе камунараўцаў за генэральную лінію партыі, за прамфінплян, за бальшавіцкія тэмпы. ЗАВОД «КАМУНАР» НА 3 ПРОЦ. ПЕРАВЫКАНАЎ ПРАМФІНПЛЯН УДАР НАГА КВАРТАЛУ.

Дэманстранты праходзяць па будынку ЦК КП(б)Б.

— Няхай жыве ленінскі ЦК! Абярэм у Менгарсавет лепшых ударнікаў!—гучнымі лёзунгамі вітаюць камунараўцы Цэнтральны Камітэт Партыі.

***

Перавыбарчы сход адкрыўся ў залі гукавога кіно «Чырвоная зорка». Камунараўцы дэманстравалі вялікую актыўнасьць, поўнае разуменьне палітычных задач перавыбарчай кампаніі. 100 проц. рабочых зьявіліся на перавыбарчы сход.

У АДЗНАКУ ПЕРАВЫБАРАЎ І ДНЯ ПАМЯЦІ ЛЕНІНА, 96 РАБОЧЫХ-УДАРНІКАЎ ПАДАЛІ ЗАЯВЫ АБ УСТУПЛЕНЬНІ Ў РАДЫ ПАРТЫІ.

У ганаровы прэзыдыум сходу выбраны палітбюро ЦК УсеКП(б) і бюро ЦК КП(б)Б.

50 дадаткаў паступіла да наказу гарсавету.

Генэральны наказ камунараўцаў — ВЫШЭЙ УЗЬНЯЦЬ СЬЦЯГ БАРАЦЬБЫ ЗА ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ, РАШУЧА ПАВЯРНУЦЦА ТВАРАМ ДА ЗАДАЧ ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА, ДА ЗАДАЧ АЖЫЦЦЯЎЛЕНЬНЯ ПЯЦІГОДКІ ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ.

— Пабудаваць рабочы клюбы на Ўкраінах гораду.

— Павялічыць колькасьць трамвайных вагонаў.

— Пабудаваць новыя дзьве лазьні; ня менш 200 дамоў уключыць у каналізацыю.

— У 1931 г. прыступіць да пабудовы парку культуры і адпачынку.

— У мэтах пашырэньня жылплёвай плошчы перавесьці работу савецкіх устаноў на двухзьменную сыстэму.

***

Бурнымі воплескамі сустракае залі зьяўленьне на трыбуне сакратара ЦК КП(б)Б тав. К. В. Гея.

Тав. Гей характарызуе адказныя задачы, якія стаяць перад новым складам гарсавету. Гарсавет 13 скліканьня павінен стаць сапраўдным гаспадаром сацыялістычнага гораду.

— СТАЦЬ НА ЧАЛЕ ЎЗРОСШАЙ АКТЫЎНАСЬЦІ РАБОЧЫХ МАС, БЫЦЬ АРГАНІЗАТАРАМ І КІРАЎНІКОМ НОВЫХ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ФОРМ ПРАЦЫ — САЦСПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА, ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ У ШТОДЗЕННАЙ РАБОЦЕ НЯЎХІЛЬНАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ ПАРТЫІ, БЯЗЬЛІТАСНУЮ БАРАЦЬБУ НА ДВА ФРОНТЫ, БОЛЬШ КЛАПАЦІЦЦА АБ ПАТРЭБАХ РАБОЧЫХ МАС—БАЯВЫЯ ЗАДАЧЫ ГАРАДЗКОГА САВЕТУ.

Тав. Гей спыняецца на сучаснай міжнароднай абстаноўцы, на росьце ваеннай небясьпекі, на падрыхтоўцы імпэрыялістычных драпежнікаў, якія шукаюць выхаду з цёскі нячуванага эканамічнага крызісу ў вайне з Савецкім Саюзам.

У адказ на спробы імпэрыялістаў мы павінны ўзмацніць абароназдольнасьць нашай краіны. Больш увагі, больш клопату аб нашай Чырвонай арміі! Гарсавет сталіцы БССР павінен паказаць прыклад бальшавіцкай работы ў адносінах узмацненьня абароназдольнасьці краіны.

***

З вялікай прамовай выступіў сакратар Менгаркому КП(б)Б тав. КАВАЛЬЧУК, які ахарактарызаваў вялікую розьніцу паміж перавыбарамі саветаў у СССР і парляманцкімі выбарамі ў капіталістычных краінах. Мэтадамі агіднай праванацыі, фабрыкацыяй фальшываў, нячуванага тэрору, бязьлітаснага праследаваньня равалюцыйных арганізацый праводзіць буржуазная «дэмакратыя» выбары ў парлямант.

Выбары ў краіне Саветаў адбываюцца на ўмовах нячуванага росту актыўнасьці і творчага энтузіязму шырокіх працоўных мас, дэманстрацыі адданасьці мас рабочых, беднякоў, сераднякоў і капгасьнікаў ідэям Леніна і яго партыі, ва ўмовах шырокага разгортваньня бальшавіцкай пралетарскай самакрытыкі, САПРАЎДЫ савецкай дэмакратыі.

Мандаты дэпутатаў камунараўцы ўручылі 13 лепшым ударнікам, энтузіястам пяцігодкі.

У гарсавет выбраны сакратар ЦК КП(б)Б тав. Гей, ударнікі т. т.: Тупін, Стэсік, Розенбэрг, Асінаўскі, Кушнэр, Акуцэнка, Ратніцкая, Элькіна, сакратар парткалектыву — Шулькін, дырэктар заводу—Левін і інш.

ПРЫ ВЯЛІКІМ УЗДЫМЕ РАБОЧЫХ ГАНАРОВЫМІ ДЭПУТАТАМІ МЕНГАРСАВЕТУ АД ІМЯ ЗАВОДУ «КАМУНАР» ВЫБРАНЫ т. т. СТАЛІН і МОЛАТАЎ.

І. ЛЯЎКОВІЧ.

Узорны прыклад яўкі

РАБОЧЫЯ ЦЯГНІКОВЫХ БРЫГАД ПРОСТА З РАБОТЫ ЗЬЯВІЛІСЯ НА СХОД

15 ЧЫГУНАЧНІКАЎ—У РАДЫ ПАРТЫІ

Партакалектыў менскага вузла разгарнуў бальшавіцкую падрыхтоўку да перавыбараў Менгарсавету. Кожнаму партыйцу і камсамольцу дана баявое, індывідуальнае заданьне правесьці ня менш чым сярод 5 рабочых гутаркі аб значэньні перавыбараў.

Партыйная і прафэсыянальная арганізацыя вызначылі пераходны сьцяг імя гарсавету за найлепшае правядзеньне перавыбараў.

Першыя падрыхтаваліся да перавыбараў паравозныя і цягніковыя брыгады вузла.

Улічваючы спэцыфічныя ўмовы работы цягніковых брыгад, прафэсыянальныя арганізацыі паладзілі дзяжурствы на працягу круглых сутак у памяшканьні варадчыкаў, у дэпо і пэхкамітэце. Былі арганізаваны ўдарныя брыгады камуністаў, якія хадзілі па кватэрах рабочых, праводзілі гутаркі сярод брыгад начных цягнікоў, разносілі выбарчыя позвы.

Бальшавіцкая падрыхтоўка да перавыбараў дала добрыя вынікі. **На выбарчы сход зьявілася 109 проц. выбаршчыкаў.** Гэта лічба тлумачыцца тым, што на перавыбарчы сход зьявіліся ўсім нечакана брыгады прыбыўшых цягнікоў, зьявіліся адразу з работы ў дарожнай вопраткі са сваімі куфэркамі і інструмантамі. Прышлі і рабочыя, якія знаходзяцца ў адпачынку.

З вялікай актыўнасьцю прайшло аб гаварэньне наказу.

Унесена 15 прапаноў і дадаткаў да наказу. **Пасьля абгаварэньня наказу выступіў стары рабочы, зачытаўшы калектыўную заяву 15 чыгуначнікаў з вытворчым стажам ад 20 да 35 год аб прыёме ў партыю:**

«У сёмую гадавіну сьмерці вашага правадыра старыя рабочыя-ўдарнікі ня могуць стаяць у баку ад гэрайчнага змаганьня партыі Леніна за сацыялізм».

У гарадзкі савет ад цягніковых брыгад Менскага вузла выбраны т. **Шаранговіч — сакратар ЦК КП(б)Б, тав. Позьняк** — прэміраваны ўдарнік, машыніст з 35-гадовым вытворчым стажам, тав. **Точка** — работніца цягніковых брыгад, член партыі, актыўны член гарсавету мінулага складу, **Курыловіч** — ударнік, камсамолец.

За добрую падрыхтоўку да перавыбараў цэх цягніковых брыгад павінен атрымаць пераходны сьцяг.

МІНЦ.

Мандат дэпутата--прэміраваным ударнікам

Адзінай згуртаванай калёнай зьявіліся дрэваапрацоўшчыкі на перавыбарчы сход у клюб Карла Маркса.

85 проц. рабочых заводу «Дрэваапрацоўшчык» прышло на перавыбары.

— Палепшыць трамвайны рух, самую сур'ёзную ўвагу аддаць рабочаму забесьпячэньню, ліквідаваць перабоі ў дастаўцы дроў і гародніны, пабудаваць новыя 2 сямігодкі, пашырыць сетку рабочых школ, прыстасаваць работу дзіцячых пляцовак да ўмоў вытворчасьці—галоўныя дадаткі да наказу. Зьвяно піянэраў фармулюе свае прапановы свае патрабаваньні да гарсавету: забясьпечыць дзіцей бедняты вопраткай, харчаваньнем і прыладамі, пабудаваць дзіцячы тэатр і г. д.

Завод «Дрэваапрацоўшчык» пасылае дэпутатамі ў гарсавет: т. Бэнэка — нам. старшыню СНК, т. Гуеўскую — работніцу-ўдарніцу, т. Кантаровіча і т. Доўнэра — прэміраваных ударнікаў, т. Шаўкаўца — сакратара парткалектыву. Кандыдатамі праходзяць т. Енкельчык і тав. Гольт — рабочыя-ўдарнікі.

5 лепшых камсамольцаў перадаюцца на сходзе ў партыю, 10 рабочых-ударнікаў падаюць заявы аб прыёме ў партыю. 9 чалавек замацоўваюць сябе да канца пяцігодкі на заводзе.

— Стаць на чале актыўнасьці мас, узьняць ролю саветаў у барацьбе за генэральную лінію партыі — асноўнае занатрабаваньне дрэваапрацоўшчыкаў.

К. Гарэлікаў.

ХТО АТРЫМАЕ СЬЦЯГ?

Першыя вынікі ўсебеларускага конкурсу на лепшае прадпрыемства

З 40 УДЗЕЛЬНІКАЎ КОНКУРСУ--11 СУР'ЁЗНЫХ ПРЭТЭНДЭНТАЎ

Конкурсная камісія па прысуджэньні трох сьцягаў — ЦК КП(б)Б, ЦСПСБ і ЦК ЛКСМБ — пачала разбор матар'ялаў аб рабоце ўдзельнікаў конкурсу на лепшае прадпрыемства. Трэба сказаць, што конкурсная камісія спачатку яляпоўнасьцю улічыла знакэньне разбору гэтых матар'ялаў і самога працэсу прысуджэньня сьцягу. Першае пасяджэньне, прысьвечанае вынікам работы лепшых прадпрыемстваў, конкурсная камісія наладзіла ў габінэце старшыні ЦСПСБ тав. Рыжова, выклікаўшы на гэта пасяджэньне толькі прадстаўнікоў чатырох прадпрыемстваў. Зразумела, што такі мэтад абмеркаваньня практыкі лепшых прадпрыемстваў ня вытрымлівае крытыкі. Бо палітычнае значэньне конкурсу ня толькі ў тым, каб таму ці іншаму прадпрыемству даць чырвоны сьцяг, але ў тым, каб формы і мэтады работы лепшых прадпрыемстваў сталі здабычаю ўсіх фабрык і заводаў БССР.

Каб паправіць сваю памылку, конкурсная камісія склікала 20-га студзеня ў клюбе харчавікоў удзельнікаў усіх лепшых прадпрыемстваў, запрасіўшы таксама рабочых, ударнікаў і актыў прадпрыемстваў. На жаль, на гэты сход прышло вельмі мала рабочых. Разьлічвалі па чалавек 500 — прышло ня больш 70. І ў гэтым віноватa конкурсная камісія, якая не паклапацілася падрыхтаваць сход, як належыць. Значная частка віны падае таксама на фабзаўкомы, якія не паведамілі рабочых аб гэтым сходзе.

***

Першы быў заслуханы даклад дырэктара Гомельскай шэйнай фабрыкі «Камінтэрн» тав. Тэкліна. Фабрыка «Камінтэрн» за ўдарны квартал сапраўды мае вялікія посьпехі ў справе мабілізацыі рабочых мас на барацьбу за выкананьне і перавыкананьне прамфінплану. Правільная перабудова партыйнай і прафэсыянальнай работы, перанясьненьне цэнтру работы на вучастак (такіх вучасткаў з «трыкутнікамі» на фабрыцы арганізавана 26), значнае разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, рашучая барацьба з рознымі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі (у ніткачным і шапачным цэхах), —усё гэта дапамагло фабрыцы поўнасьцю справіцца з задачамі ўдарнага кварталу і падрыхтавацца да трэцяга году пяцігодкі. Вось лічбы перамог:

сустрэчная праграма росту прадукцыйнасьці працы ва ўдарным квартале складала 57 проц. замест 55 проц. па квартальных лічбах;

праграма ўдарнага кварталу выканана на 101,7 проц.;

сабекошт зьніжан на 6,39 замест 6,79 проц. паводле пляну;

з'эканомлена сэкцій пляну матар'ялаў на 122.817 руб.;

колькасьць ударнікаў дасягае 63 проц. агульнага ліку рабочых;

замацаваліся да канца пяцігодкі 349 рабочых і ўвесь адміністрацыйна-тэхнічны нарсамал;

колькасьць пратулаў зьменшана да 0,01 проц. замест прадугледжаных пляном 0,05;

з 122 рабочых прапаноў прынята 105 і выканана 74 прапановы.

З іншых дасягненьняў трэба адзначыць наступныя: падпіска на пазыку «Індустрыя — за чатыры гады» дасягае 105 проц. двухтыднёвага заработку, у часе культпоходу завербавана 175 культармейцаў, за ўдарны квартал 60 рабочых з вялікім вытворчым стажам прыняты ў партыю.

Добра прапрацавала кантрольная лічба на 1931 г. Сустрэчная праграма дае рост прадукцыі на 300 тыс. руб. Сустрэчным прамфінпляном прадугледжана зьніжэньне сабекошту на 5,16 проц. замест 4,95 проц. Рост прадукцыйнасьці працы прадугледжан сустрэчным пляном на 38,2 проц. замест 32,7 проц.

Але разам з тым даклад адзначыў што ва фабрыцы ёсьць шчэ рад недахопаў як па лініі перабудовы прафработы (дзіцячая работа вытворчых нарад), перабудовы работы камсамолу, так і па лініі ажыцьцяўленьня прынцыпу адзінаначальля.

***

Другі быў заслуханы даклад пам. дырэктара Палесдруку тав. Майзьлеса. Палесдрук выканаў праграму ўдарнага кварталу на 101,5 проц., ня гледзячы на тое, што праграма павялічана сустрэчным пляном на 69 проц. Сабекошт зьніжан на 7,5 замест 8 проц. Прадукцыйнасьць працы ўзьнята на 21 проц. замест 27 проц. паводле пляну (за два месяцы).

Колькасьць ударнікаў дасягае 90 проц., самазамаханаліся на прадпрыемстве 500 рабочых з 748. Прагулы складаюць пяначную колькасьць — 6 прагульных дзён у сярэднім у месяц.

З 300 прапаноў рабочых прынята адміністрацыяй 259, выканана 195. Падпіска на пазыку дасягае 110 проц. кантрольнага заданьня.

Сустрэчная праграма на 1931 г. павялічыла кантрольную лічбу на 1 млн. рублёў.

З іншых паказальнікаў заслугоўваюць увагі — добра праведзеная падрыхтоўка да перавыбараў гарсавету, прычым рабочыя ўнесьлі ў паказ 200 прапаноў, а таксама тое, што 25 проц. рабочых ахоплена вучобай і 95 проц. рабочых выпісваюць газэты.

Але аспоўнае, за што Палесдрук заслугоўвае прэміраваньня — гэта арганізацыя новай формы ўдарніцтва, новай формы падрыхтоўкі да выкананьня прамфінпляну — **вытворчых манэўраў**, якія атрымалі шырокае распаўсюджаньне па ўсіх фабрыках і заводах БССР і многіх прадпрыемствах Савецкага Саюзу. Характэрна тое, што ўсе прадпрыемствы, якія фігуруць у якасьці кандыдатаў на атрыманьне сьцягу, ва ўдарным квартале правялі вытворчыя манэўры і дзякуючы ім дабіліся значнага эфэкту ў выкананьні прамфінпляну.

***

Наступны даклад зрабіў старшыня заўкому гомельскага заводу «Пралетары» тав. Халвін. Сустрэчны прамфінплян рабочых павялічыў кантрольныя лічбы ўдарнага кварталу на 25,6 проц. Арганізаваўшы насьпіх гэтага вопытны месяц выкананьня сустрэчнага пляну і дабіўшыся 100-процантнага яго выкананьня, рабочыя «Пралетарыя» высунулі вялічэзную праграму яшчэ на 6,9 проц. У выніку ўпартай барацьбы з рэшткамі апартуністычнага кіраўніцтва і настроямі, калектыў «Пралетара» выканаў праграму ўдарнага кварталу на 108,2 проц., зьнізіў сабекошт на 10 проц. замест 10,1 паводле пляну (за два месяцы) і амаль поўнасьцю выканаў заданьне па павялічэньні прадукцыйнасьці працы.

На заводзе шырока разгорнута ўдарніцтва: ударнікаў налічваецца 84,5 проц. усяго калектыву. З унесеных за ўдарны квартал 49 прапаноў выканана 14, якія далі 126.322 руб. эканоміі. Падпіска на пазыку дала 107,7 проц. Вучобай ахоплена 650 чал. Прынята ў партыю 70 лепшых ударнікаў, у камсамол — 48.

Адначас, на заводзе ёсьць два недахопы, якія могуць зьявіцца значнай перашкодай для атрыманьня сьцягу. Першы недахоп — гэта вялікая колькасьць прагулаў. У кастрычніку іх было 119, у лістападзе — 129 і ў сьнежні — 111, што складае ў сярэднім 0,43 проц. Другі буйны недахоп—вялікая колькасьць браку, які дасягае па чыгунна-ліцейным цэху 9,8 проц. замест 5,4 проц. паводле пляну, па медна-ліцейным цэху — 11,8 проц. замест 9 проц. паводле пляну.

Конкурсная камісія павінна высьветліць, ці не расьце колькасьць браку на «Пралетарыі» за кошт якасьці і браку?

***

Наступны даклад зрабіў старшыня заўкому заводу «Бальшэвік» тав. Рэўтовіч. Завод выканаў праграму ў колькасным азначэньні на 108,97 проц., у цэнавым азначэньні — на 104,54 проц. Сабекошт зьніжан на 12 проц. замест 8,03 проц.

У часе прапрацоўкі сустрэчнага прамфінпляну рабочыя ўнесьлі 67 рацыяналізатарскіх прапаноў, якія далі 20.567 руб. Па ўдарным квартале ўнесена яшчэ 296 прапаноў, якія далі 37 тыс. руб. эканоміі. Колькасьць ударнікаў складае 576 чал. Падпіска на пазыку дала 112,65 проц. заданьня. За ўдарны квартал 48 ударнікаў уступілі ў партыю.

Завод мае вялікія дасягненьні ў справе перабудовы культурна-масавай работы.

***

На жаль, дакладчыкі ў сваіх кароткіх дакладах (можа таму, што ім не далі патрэбнага часу) спыніліся амаль выключна на колькасных дасягненьнях, не асьвятлялі падрабязна форм і мэтадаў партыйнай, прафэсыянальнай і масавай работы, якія прывялі да перамогі. Між тым абмен практыкай работы лепшых прадпрыемстваў адкрывае вялізэрнае значэньне ў справе падцішэньня работы ўсёй нашай прамысловасьці.

Сёньня ў залі пасяджэньня ЦСПСБ адбудзецца працяг пасяджэньня конкурснай камісіі па прысуджэньні трох сьцягаў. Трэба, каб фабзаўкомы менскіх прадпрыемстваў прышлі на гэта пасяджэньне разам з актывам і ўдарнікамі і каб дакладчыкі лепшых прадпрыемстваў у сваіх дакладах абсталявалі падрабязна спыніліся на формах і мэтадах работы.

Д.

НЕ ЗАБЫВАЦЬ: СЬЦЯГ—ПЕРАХОДНЫ ПРЫЗ. Замацоўвайце і разьвівайце посьпехі ўдарнага кварталу Па-бальшавіцку змагайцеся за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну трэцяга году пяцігодкі. Дабівайцеся права на пераходны сьцяг

7 сакавіка склікаецца 3-ці ўсебеларускі зьезд калгасаў

Праўленьне Калгасцэнтру БССР пастанавіла склікаць 3-ці ўсебеларускі зьезд калгасаў 7-га сакавіка г. г. У рабоце зьезду прымае ўдзел 400 дэлегатаў.

Праўленьне зацьвердзіла наступны парадак дня зьезду: АБ МІЖНАРОДНЫМ СТАНОВІШЧЫ І ЗАДАЧАХ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА; СПРАЗДАЧА КАЛГАСЦЭНТРУ; ПЛЯН РАБОТ ПА ПРАВЯДЗЕНЬНІ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ (дакладчык тав. Міцькоў) і СУДАКЛАД УПАЎНАВАЖАНАГА ТРАКТАРАЦЭНТРУ (дакл. тав. Нанзаў); АБ СТАНОВІШЧЫ І МЕРАПРЫЕМСТВАХ ПА РАЗЬВІЦЦЮ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ Ў КАЛГАСАХ (дакл. т. Самусевіч); АРГАНІЗАЦЫЯ ПРАЦЫ Ў КАЛГАСАХ (дакл. т. Балцін); АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ КАЛГАСНЫХ КАДРАЎ (дакл. т. Калмык) І ВЫБАРЫ ПРАЎЛЕНЬНЯ БЕЛКАЛГАСЦЭНТРУ І РЭВІЗІЙНАЙ КАМІСІІ.

Для падрыхтоўкі зьезду арганізавана КАМІСІЯ ў складзе т. т. КАЛМЫКА, ПАВОРЦАВА і МІРОНАВА.

Сёньня, 24-га студзеня

у залі пасяджэньняў ЦСПСБ (пляц Волі, Дом Працы)

адбудзецца працяг пасяджэньня конкурснай камісіі пры ЦСПСБ

ПА ПРЫСУДЖЭНЬНІ

ТРОХ ПЕРАХОДНЫХ СЬЦЯГАЎ.

На пасяджэньне выклікаюцца: усе члены конкурснай камісіі, «трыкутнікі» прадпрыемстваў, якія ўступілі ў конкурс.

Запрашаюцца: рабочыя, ударнікі і актыў прадпрыемстваў г. Менску.

У парадку дня: даклады заводаў «Камунар», «Энергія» і іншых.

Пачатак роўна ў 6 гадз. вечара.

Конкурсная камісія.

Паведамленьні

Сёньня:

24-га студзеня г. г. а 1 гадзіне дня ў памяшканьні гаркому КП(б)Б Агіт. Мас. Аддз. ЦК КП(б)Б склікае нараду па пытаньні падрыхтоўкі да Міжнароднага камуністычнага дня 8-га сакавіка. На нараду выклікаюцца прадстаўнікі наступных арганізацый і устаноў:

1. Гарком КП(б)Б, 2. ЦСПСБ, 3. ЦВК, 4. Белкалгасцэнтр, 5. Белкаапсаюз, 6. ВСНГБ, 7. Наркампрацы, 8. НКА, 9. Наркамаховы ахоўры, 10. Дзяржплян, 11. Палітпрасьвет, 12. Радыёцэнтр, 13. ЦК ЛКСМБ, 14. Кустпрамсаюз, 15. Белжылсаюз, 16 Палпаводсаюз, 17. Ільнаводсаюз, 18. Белмалжылсаюз, 19 НКЗем, 20. Садсаюз, 21. КОТУ, 22. Белсельпром, 23. ЦК МОПР'у, 24. Асавіяхім, 25. ТПН, 26. Чырвоны Крыж, 27. Прадстаўнікі ўсіх газэт і Белдзяржкіно.

— **Дом Камасьветы імя Карла Маркса.** 24-га студзеня з 7-9 гадзін індывідуальная кансультацыя па палітэканоміі і эканомпалітыцы. індывід. кансульт. па эканомгеаграфіі і заняткі гуртка нямецкай мовы.

Заўтра:

— **Белбюро АРУ.** 25 студзеня, у 7 гадз. веч., у памяшк. АРУ (Савецкая, 55) адбудзецца чарговае пасяджэньне прэзыдыуму Белбюро АРУ. Парадак дня: 1) Пляны працы сэктараў, 2) Аб арганізацыі экспэртызы, 3) Аб удзеле рахункових працаўнікоў прадпрыемстваў і аб'яднаньняў у працы па мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў. Яўка членаў, кандыдатаў і равіз. камісіі абавязкова. Запрашаецца **актыў.**

— 25 студзеня, у 6 гадз. веч., у памяшканьні групкому (вул. Энгельса № 8)—збор усіх членаў 2 і 10 групкомаў саюзу працасьветы для ўдзелу ў дэманстрацыі на перавыбарчай кампаніі гарсавету, пасьля якой ідуць на выбары ў Дом Асьветы.

— **СВБ.** 25 студзеня, у 7 гадз. веч. адбудзецца нарада сакратароў ячэек СВБ у памяшк. Дому Камасьветы, Менгарсавет СВБ, пакой № 18.

Парадак дня: 1) Вынікі правядзеньня антыкаляднай кампаніі, 2) Справаздача з мес: 1) Завод «Камунар», 2) ВСНГ, 3) 7-ая рота № палка, 4) 1-я школа. На нараду запрашаюцца члены гарсавету СВБ і бязбож. актыў. Сакратары ячэек павінны зьявіцца у абавязковым парадку. Яўка абавязкова.

Прэзыдыум.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і галоўная канторa Менск, Савецкая, 63.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	13-60	Начны рэдактар	6-42
Сакратар	10-74	Галоўная канторa	7-81
Сэктар інфармацыі	6-19	Аддзел падпіскі	7-81
		„ абвестак	7-81

Умовы падпіскі:
(з дзяржаўным дадаткам „Прафрук“)

На 1 мес.	— 1 р.
„ 3 мес.	— 3 „
„ 6 мес.	— 6 „
„ 12 мес.	— 12 „

Падпіска прымаецца ўсюды на месцах.

Плата за абвесткі:
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншы тэрэдзія абвесткі—1 р. за радок. Пасьля тэксту—у два разы дарожэй. При цэнтралізаваным друкаваньні—сьпіцдна. Зьвы гарэфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—21 г. бе рэдзца 10 проц. падатку.

Абвесткі прымаюцца ў газ. канторы газэты „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 2-й паверх тэл. 7-31. 63

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“
Новая гукавая праграма
ПЛЯН ВЯЛІКІХ РАБОТ (пяцігодка)
— ЗВЫШ ПРАГРАМЫ —
1) 1905 год у буржуазнай сатыры
2) Часопіс № 4-5 Белдзяржкіно
Пачатак 7 г., 8 г. 45 м. і 10 г. 30 м.
Каса адкрыта з 5 гадз. веч.

Кіно-тэатр „Культура“
НОВЫ ФІЛЬМ ПР 1 1905 ГОД
ЖАЛЕЗНЫ АВАНГАРД
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ
Кіно-хроніка „СОЮЗКІНО“ № 70
Пачатак у 7 г., 8 г. 40 м. і 10 г. 20 м.
Каса адкрыта з 5 гадз.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“
Культурфільм вытворчасьці «СОЮЗКІНО»
ЗЬВЯНО ЭНЭРГЕТЫКІ
Пачатак 1-га сэансу—6 гадз.
Каса—з 4 гадз. 30 м.

КІНО „Пралетары“
Культур-фэльетон
НАСТУПЛЕНЬНЕ
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ
Прыгажэр пралетарыяту «пранарты»
Пачатак: 6 г., 7 г. 30 м., 9 г. 30 м.
Каса адкрыта з 4 з пал. гадз.

КІНО „Юны Піянэр“
Два фільмы ў адзін сэанс
1) Пахованьне У. І. Леніна хроніка ў 3-х частках.
2) Катуш бетаноў у 2-х частках.
Пачатак сэансу у 1 гадз. дня.
Каса адкрыта з 12 г. дня.

КІНО „СпартаК“
ДАГНАЦЬ І ПЕРАГНАЦЬ у 5-ці частках.
Зьвыш праграмы кіно-хроніка 125-годзьдзе Казанскага ўніверсытэту у 1 частцы.
Пачатак: 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 30 м.
Каса—з 5 гадзін.

ШТО ГАВОРЫЦЬ ПРЭСА ПРА КАРЦІНУ „РУБІКОН“

Водгукі аб фільме „РУБІКОН“.

Міжнародны камітэт прапаганды чыгуначнікаў і транспартных рабочых прыслаў у Белдзяржкіно водгук аб кінофільме «РУБІКОН» вытворчасьці БДК. Камітэт адзначае, што фільм палітычна вытрыманы і актуальны як па асноўнай тэме, так і па рэжысорскай трактоўцы. У фільме правільна паказаны быт і ўмовы працы замежных маракоў і ўдала прапінастаўлена жыцьцё на савецкім судне жыцьцю маракоў у капіталістычным флёце.

(«Зьвязда»).

„Вечерняя Москва“ от 29-XI—1930 г.

На фабрыцы Белдзяржкіно закончан і выпускаецца ў пракат мастацкі фільм «РУБІКОН» (тэма—рост пралетарскай клясавай сьвядомасьці ў чужаземнага марака, які прыехаў у СССР). Над фільмам працаваў малады калектыў фабрыкі Белдзяржкіно, разам з рэжысорам В. Вайнштон. Сцэнары — А. Менскага, аператар — А. Кільцаты.

Камскład Чырвонай арміі аб „РУБІКОНЕ“.

28 лістапада пастановачная група карціны «РУБІКОН» выехала ў школу па ўдасканаленьні камандзіраў Чырвонай арміі. Пасьля прагляду карціны адбылася актыўная дыскусія.

Адзадушна былі прызнаны палітычная актуальнасьць і зьмест карціны. Адзначыўшы яе мастацкую вартасьць, камскład Чырвонай арміі вынес пажаданьне як хутчэйшага выпуску на экран.

У адпаведнасьці прынятай рэзалюцыі адзначана, што рэалістычная форма і образнасьць карціны забясьпечваюць ёй вялікі посьпех у рабоча-селянскіх аўдыторыях. Карціна, на думцы сходу, будзе палітычна арганізоўваць і выхоўваць масавага гледача.

(«Кіно-газета»).

Аддзел Кадраў ЦК КП(б) Бел.

прапануе ўсім членам КП(б) Бел. скончыўшым ІКП, курсы марксызму, асьпірантуру б. Раніфа, а таксама камвузы: Свердлоўскі ўніверсытэт, Ленінградзкі ўсесаюзны камвуз, ГЖК, КУТВ і КУНМЗ (незалежна ад тэрміну скончэньня), паведаміць не пазьней 31 с. студзеня г. г. у пісьмовай форме аб сваім месцы прабываньня і выконваемай работе, на ўлоты сэктар аддзелу кадраў ЦК КП(б) Бел. па наступнай форме:

1. Прозьвішча, імя і імя па бацьку.
2. Які камвуз скончыў і ў якім годзе.
3. Партыйны стаж.
4. Сацыяльнае становішча.
5. Год нараджэньня.
6. Нацыянальнасьць.
7. Прабываньне ў іншых партыях.
8. Дзе і ў якасьці каго прапанаў з моманту скончэньня камвузу да сучаснага моманту.
9. Дзе і ў якасьці каго працуе ў сучасны момант.
10. Пасада знаходжаньня ўстановы ці прадпрыемства.
11. Назва